

СУСЕДСКІЯ СПРЭЧКІ І АСАБІСТЫЯ МЕЖЫ 7



ПАЎНОЧНАЯ ХАДА. КАМУ ЯНА ПАДЫХОДЗІЦЬ? 8



28 КРАСАВІКА 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 82 (29704)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА


Блізкая ўлада

## ВАЖНА БАЧЫЦЬ І ЧУЦЬ НАШЫХ ЛЮДЗЕЙ

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла прыём грамадзян у Асіповіцкім райвыканкаме**

**Адзін прыйшоў са скаргай, другі — з надзеяй на дапамогу, трэці — каб выказаць незадаволенасць адказамі мясцовых улад, а ў кагосьці праблемы, выкліканыя эканамічнымі цяжкасцямі і санкцыямі. Ні адзін зварот не быў пакінуты без увагі, Наталля Качанава ўважліва выслухала ўсіх, хто запісаўся на прыём.**



Фота БелТА.

У жыхара Асіповіч уласная дрэваапрацоўчая вытворчасць. Прадукцыя яго фірмы карыстаецца попытам у Еўропе, яе добра бралі ў Польшчы і Германіі. Але апошнім часам працэс запаволіўся. Прадпрымальнік летам збіраецца запусціць яшчэ адну вытворчасць, нават узяў у лепшыя часы на гэта крэдыт. СТАР. 2

Парламенцкі дзённік

## КАЛІ МІР — НАЙВАЖНЕЙШАЯ КАШТОЎНАСЦЬ

**На чарговым пасяджэнні восьмай сесіі Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання дэпутаты разгледзелі і прынялі рашэнні ў адносінах да дзевяці законапраектаў**

**Акрамя таго, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА паставіў перад парламентарыямі задачы на найбліжэйшую перспектыву, ад якіх залежыць суверэнітэт і будучыня Беларусі.**



Фота БелТА.

— Гэта датычыцца, у першую чаргу, пераўтварэння грамадска-палітычнай сістэмы згодна з абноўленай Канстытуцыяй і адаптацыі нацыянальнай эканомікі да архітэктуры светагаспадарчых сувязяў, якая складваецца, — адзначыў спікер ніжняй палаты парламента. — У гэтых мэтах кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача неадкладна разгарнуць работу па прывядзенні дзеючага заканадаўства ў адпаведнасць з Канстытуцыяй. Літаральна на днях быў зацверджаны дэталёвы план дзейнасці ўсіх дзяржаўных органаў па падрыхтоўцы і прыняцці адпаведных заканадаўчых актаў. СТАР. 2

# Палёт фантазіі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Бялыніцкім раёне ёсць вёска Сцёхава. Дом, з якога пачынаецца гэты населены пункт, прэтэндуе на званне «Сядзіба ўзорнага парадку», бо сваім дагледжаным, вясёлым і нават урачыстым абліччам выклікае самыя добрыя і станоўчыя эмоцыі. Майстар, які ўпрыгожыў і дом, і падворак, — пенсіянер Валерый САЛЫМСКІ. Цяпер Валерый Аляксеевіч упрыгожвае вокны ліштвамі з птушкамі — філасофскімі сімваламі міру, вернасці, шчасця.

*Працяг пра сцёхаўскага майстра і яго дом глядзіце на 3-й стар.*

ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ШЛЫЧКОЎ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях:**

*«Нацыянальнае заканадаўства дастаткова жорстка, аж да суда, дазваляе адстойваць правы беларускіх праваўладальнікаў. На жаль, падрабляюць і айчынную прадукцыю, і нашых вытворцаў, і беларускія брэнды. Аднак страшныя не столькі падробкі ўнутры нашага рынку, колькі падробка за межамі Беларусі. Паколькі ў нас экспартна арыентаваная эканоміка, мы сур'ёзна зацікаўленыя ў абароне правоў нашых праваўладальнікаў за мяжой».*

Свая справа

## «У МАЛЫМ БІЗНЕСЕ НЯМА СЛОВА «ТРЭБА», ТУТ ГУЧЫЦЬ «Я ХАЧУ»

**Кіраўнік бізнес-інкубатара — пра тое, чым варта заняцца цяпер, каб быць паспяховымі, і якімі якасцямі трэба для гэтага валодаць**



Фота БелТА.

**Адрас «аграгарадок Калодзішчы, Мінская, 5», верагодна, знаёмы многім бізнесменам-пачаткоўцам Міншчыны. Менавіта тут месціцца 4-павярховы адміністрацыйны будынак інкубатара малога прадпрымальніцтва ЗАТ «МАП ЗАТ» Мінскага раёна. У ім знайшлі свой першы дом многія ідэі, якія ператварыліся ў рэальныя бізнес-праекты. У лепшыя для краіны часы з-пад крыла ментараў інкубатара выляталі ў свет паспяховыя стартапы, што натхнялі іншых прадпрымальных мінчукоў. Ці гатовыя ў крызіс «спрабаваць свае крылы» маладыя бізнесы і якія вышыні могуць браць, расказаў генеральны дырэктар інкубатара Сяргей НАЙДОВІЧ.**

***— Інкубатар існуе ўжо больш за 20 гадоў. Раскажыце крыху пра гісторыю яго ўзнікнення.***

— Інкубатар працуе з 1989 года, таму расказаць крыху пра нас не атрымаецца. Паглядзіце, якая колькасць віншаванняў, дыпломаў, узнагарод! Інкубатары малога прадпрымальніцтва ўзніклі як адказ на выклікі, звязаныя з разнастайнымі крызісамі. Гэта інструмент, які дазваляе людзям знайсці выйсце ў складаных сітуацыях. Наша пазіцыя: крызіс — гэта магчымасць для чалавека разгледзець сябе па-іншаму, знайсці новыя шляхі для развіцця і спосабы вырашэння праблем. Увогуле, малы бізнес заснаваны на ініцыятыве і жаданні чалавека. Мы ў сваім цэнтры размяшчаем прадпрыемствы, суправаджаем іх, знаёмім між сабой. СТАР. 2

Без тэрміну даўнасці

## Нямецкая фабрыка смерці пад Гомелем

**Не менш за тры дзясяткі расстрэльных ям часоў нямецка-фашысцкай акупацыі трэба будзе ў найбліжэйшы час даследаваць пошукавікам і супрацоўнікам пракуратуры ў Чонкаўскім лесе Гомельскага раёна.**




— Тут была сапраўдная фабрыка смерці. Дыслацыраваўся карны нямецкі батальён, стаяла тэхніка. Маштаб зверстваў фашыстаў уражвае. Астанкі, якія былі знойдзены восенню мінулага года, — гэта малая частка з таго, што яшчэ давядзецца падняць з-пад зямлі, — звяртае ўвагу журналістаў **пракурор Гомельскай вобласці Віктар МАРОЗАЎ** падчас наведвання месца масавага знішчэння мірных грамадзян часоў вайны ў Чонкаўскім лесе.

Як вядома, восенню мінулага года падчас пошукавых работ на гэтай тэрыторыі былі выяўлены 13 месцаў расстрэлу. Спецыялісты правялі 29 медыка-крыміналістычных экспертыз. Устаноўлена, што ідэнтыфікаваныя астанкі з расстрэльных ям належаць 489 мірным жыхарам, пераважна жанчынам. СТАР. 7

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Мінабароны Турцыі выказалі надзею на сустрэчу Пуціна і Зяленскага «найбліжэйшымі днямі»



**Міністр нацыянальнай абароны Турцыі Хулусі Акар ад імя кіраўніцтва сваёй краіны выказаў надзею, што ў найбліжэйшыя дні Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну і яго калегу з Украіны Уладзіміру Зяленскаму ўдасца сустрэцца па прапанове кіраўніка Турцыі Таіпа Эрдагана, перадае РІА «Навіны», спасылаючыся на прэс-службу міністра.**

Па словах Акара, Турцыя першапачаткова агучвала сваю пазіцыю: яна спрабавала прадухіліць узброеныя сутыкненні, а пасля пачатку спецаперацыі старалася забяспечыць больш хуткае спыненне агню. Ён нагадаў, што кіраўнікі МЗС Расіі і Украіны сустракаліся на дыпламатычным форуме ў Анталіі, пасля была сустрэча дэлегацый у Стамбуле. Акрамя таго, прэзідэнт Эрдаган неаднаразова праводзіў тэлефонныя размовы з Пуціным і Зяленскім, на якіх імкнуўся як мага хутчэй арганізаваць іх сустрэчу за сталом перагавораў.

«Мы спадзяёмся, што, нягледзячы на некаторыя цяжкасці, у найбліжэйшыя дні, магчыма, з прапановамі нашага прэзідэнта, удасца сысціся двум лідарам», — аб'явіў міністр.

Ён дадаў, што Турцыя прадаўжае ўносіць свой уклад для прадухілення пагаршэння гуманітарнай сітуацыі і дзеля хуткага спынення агню.

ISSN 1990 - 763X
22082>
9 771990 763008

### Цэны на прадукты харчавання ў ЗША дасягнулі рэкорду 1980-х гадоў

**У ЗША цэны амаль на ўсе катэгорыі прадуктаў харчавання дасягнулі рэкорду 1980-х гадоў, піша амерыканская газета The Washington Post.**

Павышэнне цэн у Злучаных Штатах выклікана шэрагам фактараў, сярод якіх недахоп рабочай сілы, больш высокая цана паліва і перабоі ў ланцужках паставак з-за пандэміі, якія зацягнуліся. Але з'явіліся і новыя фактары, што ўплываюць на рост інфляцыі ў краіне і, у прыватнасці, на падаражанне прадуктовага кошыка.

Так, вялікі ўплыў на кошт прадуктаў харчавання ў ЗША аказваюць падзеі ва Украіне. На мінулым тыдні ф'ючарсы на кукурузу на Чыкагскай таварнай біржы перавысілі $8 за бушаль, дасягнуўшы максімальнага ўзроўню за дзесяцігоддзе.

### У Растове двухгадовая дзяўчынка ўстанавіла два сусветныя рэкорды па плаванні

**Маленькая спартсменка за рэкордны час праплыла дыстанцыі 25 і 50 метраў вольным стылем. Дзяўчынцы ўдалося палепшыць вынік і трапіць у міжнародную кнігу рэкордаў InterRecord, паведамляе kp.ru.**

Дзяўчынка займаецца плаваннем з чатырох месяцаў, яна стала адзінай маленькай растаўчанкай, якой дазволілі трэніравацца ў глыбокім басейне для дарослых спартсменаў. Пайсці на рэкорд бацькам прапанаваў трэнер.

«Страху ў яе ні хвіліны не было, ёй вельмі падабаецца плаваць, яна дастаткова вынослівая, у яе ўсё адразу атрымліваецца», — расказаў настаўнік спартсменкі Уладзіслаў Брыжаты.

25 метраў дзяўчынка праплывае за 1 хвіліну і 30 секундаў, а дыстанцыя 50-метровага басейна пакараецца ёй за тры з паловай хвіліны. Сям'я юнай спартсменкі спадзяецца вырасціць з яе будучую чэмпіёнку.

КОРАТКА

- **Выстаўка «За адвагу, стойкасць і мужнасць» пройдзе ў музеі ВАВ.**
- Турыстычны форум «Спадчына Беларусі» да Года гістарычнай памяці стартуе 28 красавіка ў Мінску.
- **Прэм'ера пад адкрытым небам: у Брэсцкай крэпасці пакажуць драму «1941. Крылы над Берлінам».**
- У пунктах пропуску на беларускай дзяржграніцы будзе ўведзена абавязковая дэзынфекцыя транспарту.
- **Эксперыментальныя ўстройствы для аховы ЛЭП ад птушак пачалі ўстанаўліваць у Магілёўскай вобласці.**
- Беларусь плануе нарасціць экспарт харчавання да $8 млрд да 2025 года.
- **У Беларусі ў 2021 годзе вырашчана каля 15 тысяч тон рыбы.**

Спажывай разумна!

## ЦЫМБАЛЫ, ВЕЛАТРЭНАЖОР І ЦУДА-ЛЯМПА

**Што людзі бяруць напракат і каму гэта выгадна**

**Сёння любую рэч можна купіць у краме. Як кажуць, былі б грошы. Але нават калі і ёсць такая магчымасць, не заўсёды мэтазгодна набываць той жа велатрэнажор ці дзіцячы манежык. Па-першае, не ўсімі рэчамі мы карыстаемся доўга і часта. Па-другое, кватэра, як ні круці, не гумовая, далёка не ва ўсіх ёсць месца для захоўвання габарытных рэчаў. Вось тут і прыходзяць на дапамогу пункты пракату. Што людзі сёння бяруць у арэнду і ў якім выпадку гэта сапраўды выгадней за пакупку?**



### ПАЕЗДКА НА ЭЛЕКТРАМАБІЛІ — У ПАДАРУНАК

Арандаваць сёння можна практычна ўсё: ад электронных вагаў да электракара. Упершыню пра кароткатэрміновую пахвілінную арэнду аўто праз смартфон я даведалася, калі мае сталічныя сябры прыехалі ў госці да нас у вёску на іншамарцы з надпісам «каршэрынг» (англ. carsharing ад car «легкавы аўтамабіль» і sharing «сумеснае выкарыстанне, перадача іншаму»). Сяргей мае правы кіроўцы, але прынцыпова не набывае сабе машыну.

— Па горадзе вельмі зручна карыстацца на метро. А калі мне трэба раз на два месяцы з'ездзіць з сям'ёй да цешчы ў Краснаполле ці да вас у госці, дык я вазьму машыну ў арэнду. Затое галава не баліць, дзе яе захоўваць, як рамантаваць, не трэба плаціць за тэхагляд. СТАР. 5

# ВАЖНА БАЧЫЦЬ І ЧУЦЬ НАШЫХ ЛЮДЗЕЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Зараз грошы трэба вяртаць, а ў яго з-за санкцый праблемы з «абароткай». Ён прыйшоў на прыём да Старшыні Савета Рэспублікі з просьбай дапамагчы яму з адтэрміноўкай крэдыту. Старшыня Асіповіцкага райвыканкама Канстанцін Жыгуцкі пацвердзіў, што бізнесмен надзейны, знаходзіць агульную мову з мясцовай уладай. Наталля Іванаўна падбадзёрыла мужчыну, паведаміла, што ў краіне працуе штаб, які аказвае ў гэты складаны час дапамогу прадпрымальнікам, і яна абавязкова пракантралюе вырашэнне гэтага пытання.

Яна таксама паабяцала, што будзе вывучана работа яшчэ аднаго прадпрымальніка, з прэтэнзіяй на якую звярнуўся жыхар аграгарадка Каменічы Асіповіцкага раёна. Ён паведаміў, што той узяў у арэнду возера і не дазваляе жыхарам лавіць бясплатна рыбу. Між тым першапачаткова з ім была дамоўленасць, што гэта будзе магчыма раз на тыдзень. Але мужчына ўсё перайграў, ды яшчэ і абражае аднавяскоўцаў...

Жыхарка аграгарадка Трылесіна Дрыбінскага раёна прыехала на прыём, каб высветліць пытанне працаўладкавання. Філіял абласной псіхіятрычнай бальніцы ў аграгарадку закрываецца, і 57 чалавек застаюцца без работы.

— У Дрыбінскай ЦРБ усяго пяць вакантных месцаў, — паведаміла жанчына. — Прапануюць ездзіць на работу ў Магілёў, але ж да яго 50 кіламетраў.

Наталля Качанава ўзяла пытанне на кантроль, каб вывучыць яго разам з Міністэрствам аховы здароўя і Магілёўскім аблвыканкамам.

Сур'ёзная праблема, з якой могуць сутыкнуцца і іншыя людзі, вымалявалася з падачы жыхаркі Асіповіч, якая разам са сваім мужам мае статус сіраты. Яна стаіць у чарзе на кватэру з 2009 года, але шанцаў дачакацца яе мала. Сёння жанчына ў чарзе 164-я, а ў год у Асіповічах для гэтай катэгорыі грамадзян будуюць усяго 5-6 кватэр. Па сціплых падліках, чарга падыдзе толькі гадоў праз 35. Наталля Іванаўна абяцала прапрацаваць гэтае пытанне з міністэрствамі будаўніцтва і ЖКГ. Не выключана, што нешта трэба будзе падкарэкціраваць заканадаўча.

Не менш актуальнае пытанне датычыцца садовых таварыстваў. На прыём звярнуўся бабруйчанін, старшыня садовага таварыства «Ясень», які паскардзіўся на дрэнную дарогу да дачнага пасёлка. Дарога, як высветлілася, — толькі частка праблем. Галоўнае — попыт на дачныя соткі апошнім часам упаў. З 800 дамоў, якія размешчаны на тэрыторыі таварыства, сёння 500 пустуе. І колькасць іх толькі павялічваецца.

— Гэта пытанне неабходна ўлічыць пры распрацоўцы зямельнага заканадаўства, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента. — Нядрэнна было б правесці інвентарызацыю падобных участкаў.

На прыём да спікера Савета Рэспублікі едуць людзі нават з іншых абласцей. Так, жыхарку Оршы дэлегавалі яе суседзі. Агульная праблема — дрэнная дарога, якую яны мараць заасфальтаваць. Праблеме ўжо год, нельга сказаць, што яе не вырашаюць. Але пакуль толькі на паперы. Жанчына прывезла дакумент, дзе было пазначана, што пытанне з дарогай «плануецца разгледзець у 2025—2030 гадах». Наталля Качанава паабяцала дэталёва разабрацца з гэтым пытаннем і дапамагчы.

Усяго на прыёме было разгледжана некалькі дзясяткаў пытанняў. Асноўная іх частка паступіла ад мясцовых жыхароў, але былі таксама прадстаўнікі Мінскай вобласці, Магілёва, Бабруйска, Быхаўскага, Клічаўскага, Кіраўскага і Дрыбінскага раёнаў.

Кожнае пытанне будзе старанна разбірацца з прыцягненнем спецыялістаў, якія курыруюць тыя ці іншыя сферы. Такая зваротная сувязь, на думку Наталлі Качанавай, проста неабходная ўсёй вертыкалі ўлады, каб быў бачны ўвесь зрэз праблем, з якімі сутыкаюцца людзі. Тут галоўнае — дакладнае выкананне абавязкаў на месцах, у тым ліку па рабоце са зваротамі грамадзян.

Наталля Качанава адзначыла, што практыка адзіных дзён прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі зарэкамендавала сябе вельмі станоўча.

— У рэгіёне мы робім стаўку на тых людзей, якія тут жывуць, якіх цікавіць развіццё гэтай тэрыторыі, — рэзюмавала яна. — Грамадзяне прыходзяць з тым, што іх хвалюе, бо ў іншых інстанцыях не знайшлі паразумення. На жаль, усё яшчэ існуюць валакіта і адпіскі. Цікава, што частка пытанняў здымаецца яшчэ да прыёму. Што гэта, як не нежаданне адказных асоб своечасова прымаць рашэнні па пытаннях грамадзян?

Наталля Іванаўна таксама звярнула ўвагу, што такія прыёмы дапамагаюць удасканальваць існуючую заканадаўчую базу. У Асіповічах людзі акцэнтавалі праблемы з садовымі таварыствамі. А яшчэ — транспартныя пытанні, калі жыхары маюць праблемы з перамяшчэннем у межах свайго раёна.

— На VI Усебеларускім народным сходзе мы казалі пра моцныя рэгіёны, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента. — Калі мы жадаем, каб сельскія раёны развіваліся, нельга, каб узнікалі такія складанасці.

Наталля Качанава нагадала таксама, што работа па маніторынгу цэн і асартыменту ў крамах працягваецца. Невыпадкова яна цікавіцца ў людзей, якія запісаліся на прыём, пра заўвагі. Наталля Качанава таксама адзначыла, што за апошнія сем гадоў Асіповічы прыкметна папрыгажэлі, больш утульнымі сталі вуліцы і агульны дызайн.

Учора адзіны дзень прыёму грамадзян сенатары праводзілі па ўсёй Магілёўскай вобласці. Члены Савета Рэспублікі наведалі раёны і выслухалі просьбы, прапановы, скаргі, каб дэталёва разабрацца ў праблемах і прыняць рашэнні. Як паведамілі ў прэсслужбе Савета Рэспублікі, на прыём да парламентарыяў запісалася болей чым 200 чалавек. Сёння ў Бялынічах пройдзе выязное пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі на тэму «Аб эфектыўнасці і выніках работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у Магілёўскай вобласці».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*г. Асіповічы.*

# КАЛІ МІР — НАЙВАЖНЕЙШАЯ КАШТОЎНАСЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, Канстытуцыя была напісана разам з народам, і такім жа чынам павінны быць напісаны законы, якія яе развіваюць. «Людзі павінны бачыць, як на практыцы рэалізоўваюцца ідэі, за якія яны прагаласавалі на рэферэндуме», — удакладніў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Ён адзначыў, што самым сур'ёзным чынам варта падысці і да блока законапраектаў у сферы эканомікі. «Безумоўна, той факт, што ў свой час мы зрабілі стаўку на ўнутраныя рэзервы, нарошчванне прамысловага капіталу, дапамагае нам трымаць санкцыйны ўдар, — перакананы спікер. — Аднак трэба разумець, што жорсткая эканамічная вайна, развязаная ЗША і іх саюзнікамі, будзе нарастаць, нават нягледзячы на тое, што такія дзеянні наносяць шкоду інтарэсам грамадзян гэтых краін. Выстаяць у гэтай барацьбе мы зможам, калі аператыўна перабудуем нацыянальную эканоміку, выкарыстоўваючы яе канкурэнтныя перавагі і патэнцыял саюзніцкіх адносін з дружалюбнымі для нас дзяржавамі».

Закрануў Уладзімір Андрэйчанка і негатыўныя з'явы, якія адбываюцца ў суседніх краінах. «На жаль, у сучаснай Еўропе адраджаецца ідэалогія расавай перавагі. Зносяцца помнікі воінам-вызваліцелям, расце колькасць актаў вандалізму на савецкіх воінскіх пахаваннях. На жалобныя мерапрыемствы памяці вязняў лагераў смерці ў Германіі дэманстратыўна не запрашаюцца прадстаўнікі Беларусі і Расіі. Адбываецца публічны здзек з дзяржаўных сімвалаў нашай краіны. Гэта непасрэднае наступства спроб перагляду вынікаў Другой сусветнай вайны. Таму нам трэба ўзмацніць работу па абароне гістарычнай праўды», — сказаў ён.

Паводле яго слоў, важнай падставай для гэтага ўжо ў хуткім часе стане рэспубліканская акцыя «Беларусь памятае. Памятаем кожнага» і правядзенне ў чэрвені гэтага года міжнароднай парламенцкай канферэнцыі «Гістарычная памяць: Вялікая Перамога, здабытая адзінствам». «Дэпутатам неабходна ўзяць самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні гэтых мерапрыемстваў», — адзначыў спікер.

«Трэба зрабіць дакладны пасыл сусветнай супольнасці: перагляду гісторыі, гераізацыі нацыстаў, іх саўдзельнікаў, апраўдання экстрэмізму і рэваншызму ў Беларусі не будзе», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. — Гэта наша прынцыповая, жорсткая пазіцыя. Мы абавязкова захаваем той духоўны стрыжань, які змацоўвае пакаленні беларускага народа, у імя будучыні Беларусі і яе грамадзян», — дадаў ён.

Кажучы аб задачах міжпарламенцкай дзейнасці і працягу міралюбівага знешнепалітычнага курсу краіны, Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што мір для нас — найважнейшая каштоўнасць. «Нашы партнёры павінны выразна ўсведамляць, што без суверэннай і паспяховай у сацыяльна-эканамічных адносінах Беларусі не можа быць паўнавартаснага міру і стабільнасці ў рэгіёне, — удакладніў ён. — Нягледзячы на беспрэцэдэнтны ціск, краіна застаецца адказным удзельнікам міжнародных адносін. Таму вырашэнне праблем еўрапейскай бяспекі без раўнапраўнага ўдзелу Беларусі контрпрадукцыйнае і не адказвае інтарэсам народаў краін рэгіёна. Што датычыцца ўнутранай сітуацыі ў краіне, то яна кантралюемая».

У дадзеным плане трымаюць руку на пульсе і дэпутаты. Пра гэта, у прыватнасці, сведчыць і новы законапраект «Аб змяненні Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь», які парламентарыі разгледзелі ў першым і другім чытанні. Дакумент, рэзанансны нават сярод саміх дэпутатаў, будзе прыняты з мэтай аказання стрымальнага ўздзеяння на дэструктыўныя элементы, а таксама для дэманстрацыі рашучай барацьбы дзяржавы з тэрарыстычнай дзейнасцю.

— Паглядзіце, у якой няпростай знешнепалітычнай сітуацыі мы сёння жывём: відавочна, што працягваецца дэстабілізацыя і грамадска-палітычнай, і эканамічнай абстаноўкі ў нашай краіне, — звярнула ўвагу **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ.** — І калі раней гэта было менш радыкальна, то цяпер мы бачым канкрэтныя радыкальныя праявы і заклікі, якія, на жаль, падтрымліваюцца і замежнымі дзяржавамі, і арганізацыямі. Сёння праваахоўныя органы фіксуюць значную колькасць тэрарыстычных памкненняў у адносінах да крытычна важных аб'ектаў: транспартнай інфраструктуры, ваеннай, энергетычнай. Безумоўна, трэба паставіць дакладны заканадаўчы бар'ер, і меры за здзяйсненне такіх злачынстваў павінны быць адэкватнымі, папераджальнымі і прэвентыўнымі. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь павінны адчуваць сябе абароненымі.

Парламентарыямі прапаноўваецца адносна злачынстваў, якія датычацца тэрарыстычных актаў, увесці смяротнае пакаранне за замах на злачынства. Па словах Марыны Лянчэўскай, гэта састаў няскончанага злачынства, якое не было здзейснена суб'ектам па незалежных ад яго абставінах і магло прывесці да сур'ёзных надзвычайных здарэнняў і масавай гібелі людзей. Заканадаўствам таксама прадугледжана, што калі чалавек, які рыхтуе тэрарыстычны акт, своечасова адумаецца і паведаміць аб гэтым у кампетэнтныя органы, у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам, такая асоба будзе вызвалена ад крымінальнай адказнасці.

Парламентарыі ў першым чытанні разгледзелі і праект новага закона — «Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці». У ім рэалізаваны асноўныя патрабаванні, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы, аб ссоўванні акцэнтаў на абарону правоў прадпрыемстваў, якія апынуліся ў складанай фінансавай сітуацыі, зняцці залішняй нагрузкі з судоў, ускладанні каардынацыі працэсу ў працэдурах банкруцтва на ўрад, а таксама мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўлады.

Як паведаміла **член Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Святлана ГОРВАЛЬ,** самая галоўная ідэя прыведзенага закона — не ліквідацыя прадпрыемства, а яго дасудовае аздараўленне. «Задача заключаецца ў тым, каб ліквідаваць банкруцтва ў нашай краіне, каб дапамагчы прадпрыемствам, якія апынуліся ў цяжкім фінансавым становішчы, і ніхто лепш, чым мясцовыя органы ўлады, тое не зможа зрабіць, — удакладніла парламентарый. — Такім чынам мы здымаем нагрузку і з эканамічных судоў. І гэта правільна: у судах працуюць юрысты, а не эканамісты. Яны не могуць у поўнай меры ацаніць фінансавую гаспадарчую дзейнасць прадпрыемства».

Акрамя таго, дэпутатамі былі разгледжаны законапраекты, якія датычацца ўдасканалення прававога рэгулявання дзейнасці Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, дапаўненняў у асновы сістэмы прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх, удакладнення дзейнасці ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў, унясення карэктываў у заканадаўства па крымінальнай адказнасці. Таксама былі ратыфікаваны пагадненні, якія датычацца ўзаемадзеяння па лініі АДКБ і супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў сферы перавозкі ядзерных матэрыялаў.

Дэпутаты выказаліся і на злабадзённыя тэмы. У прыватнасці, парламентарыі не могуць заставацца абыякавымі да здзеку з памяці савецкага салдата і перапісвання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Як лічыць **член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Ірына ДАЎГАЛА,** ашалелая палітыка хвалёнай Еўропы па зносе помнікаў выходзіць за межы простага чалавечага разумення. «Не ваша пакаленне, спадары еўрапейцы, іх устанаўлівала, — акцэнтавала ўвагу парламентарый. — Гэта даніна памяці тым, хто цаной свайго жыцця вызваляў вашых жыхароў, вашу зямлю ад карычневай чумы. Як хутка вы забыліся, хто патушыў печы Асвенцыма. Толькі на тэрыторыі Польшчы было шэсць лагераў смерці! Сваімі зносамі помнікаў вы не сатраце нашы памяць і боль. Час збіраць камяні прыйдзе, і новым пакаленням вашых краін будзе пакутліва балюча за вашы дзеянні».

**Вераніка КАНЮТА.**

Лічбавы свет

# ЭЛЕКТРОННЫ ЎРАД БЕЛАРУСІ

## Спецыялісты расказалі, як у краіне развіваюцца віртуальныя стасункі



**Аператыўнае і эфектыўнае ўзаемадзеянне дзяржавы з бізнесам і грамадзянамі здольны забяспечыць электронны ўрад — сістэма дзяржаўнага кіравання, заснаваная на аўтаматызацыі кіраўнічых працэсаў у маштабах краіны, упэўнены Раман ГРАДУСАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг (НЦЭП). У 2020-м беларусы атрымалі каля 6,5 млн электронных паслуг, летась — 17 млн, а за сёлетнія тры месяцы — ужо больш за 13 млн. Спецыялісты цэнтра расказалі, што адбываецца ў галіне лічбавізацыі стасункаў.**

### Адзіныя правілы для розных паслуг

Сістэмнае фарміраванне электроннага ўрада ў нашай краіне пачалося ў 2003-м, калі была зацверджана Дзяржпраграма інфарматызацыі «Электронная Беларусь». Аднак лічбавае ўзаемадзеянне было прадстаўлена толькі ўнутры некалькіх ведамстваў у выглядзе разнастайных сістэм, якія выкарыстоўвалі свае спосабы ідэнтыфікацыі, сістэмы абароны інфармацыі і механізмы функцыянавання. За межы пэўнага ведамства электроннае ўзаемадзеянне, як правіла, не выходзіла, нагадаў дырэктар НЦЭП:

— За першыя два гады з моманту стварэння цэнтра электронных паслуг былі ўведзены ў эксплуатацыю паслугі электроннага дакументаабароту на базе сістэмы электроннага дакументаабароту SMBusiness. Сфарміраваны фармат абмену данымі паміж абанентамі сістэмы міжведамаснага дакументаабароту дзяржорганаў краіны. Для выпуску адзіных ключэй электроннага лічбавага подпісу (ЭЛП) адкрыты Рэспубліканскі цэнтр для сведчання Дзяржаўнай сістэмы ўпраўлення адкрытымі ключамі праверкі ЭЛП. Сфарміраваны інстытут інфармацыйных пасрэднікаў для аказання электронных паслуг Агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы і мадэрнізаваны Адзіны партал электронных паслуг.

У 2015—2016 гг. арганізацыя атрымала ліцэнзію на права дзейнасці ў галіне сувязі. НЦЭП вызначаны нацыянальным аператарам давеpанага трэцяга боку па прызнанні сапраўднасці электронных дакументаў падчас міждзяржаўнага электроннага ўзаемадзеяння, а таксама ўпаўнаважаным аператарам інтэграцыйнага шлюза нацыянальнага сегмента інтэграванай інфармацыйнай сістэмы ЕАЭС.

З 2017-га цэнтр стаў афіцыйным пастаўшчыком паслуг хостынгу. У 2020 годзе завяршылася Дзяржпраграма развіцця лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства на 2016—2020 гг. У яе рамках была створана Беларуская інтэграваная сэрвісна-разліковая сістэма (БІСРС) — комплекс інфармацыйных сістэм і рэсурсаў, прызначаны для ідэнтыфікацыі карыстальнікаў (фізічных і юрыдычных асоб) з прымяненнем ID-картак з мэтай аказання ім электронных паслуг, у тым ліку адміністрацыйных працэдур, дадаў Раман Градусаў:

— Стварэнне такой сістэмы — важны крок у фарміраванні электроннага ўрада, які стаў сувязным звяном паміж дзяржавай, бізнесам і грамадзянамі ў лічбавым свеце. Яна дазваляе аб'ядноўваць розныя ведамасныя інфармацыйныя сістэмы і дае грамадзянам магчымасць атрымліваць электронныя паслугі па ўсёй Беларусі на аснове адзіных правіл і інструментаў — ID-карткі і Адзінай сістэмы ідэнтыфікацыі фізічных і юрыдычных асоб.

Асноўная задача цэнтра — стварэнне базавых элементаў электроннага ўрада для эфектыўнага міжведамаснага ўзаемадзеяння і аказання электронных паслуг насельніцтву і бізнесу, кажуць яго спецыялісты. У цэнтры распрацаваны 153 паслугі аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы і 65 адміністрацыйных працэдур. А таксама паслугі па выпуску базавага атрыбутнага сертыфіката да сертыфіката фізічнай асобы, атрыбутнага сертыфіката для работы сістэмы Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, інфармацыйнай сістэмы «Універсальная сістэма доступу», аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «Ведамасны архіў», інфармацыйнай сістэмы відэа-канферэнц-сувязі, якой прадугледжана перадача службовай інфармацыі для абмежаванага распаўсюджвання.

### Замежнікі, аўтамабілі, рыэлтары...

Каманда НЦЭП на працягу дзесяцігоддзя старалася ствараць сэрвісы, якія рабілі б узаемадзеянне кліентаў безбар'ерным, зручным і эфектыўным як паміж сабой, так і з дзяржавай. У сваёй далейшай рабоце спецыялісты цэнтра арыентуюцца на запатрабаваныя сэрвісы, што будуць карысныя не толькі грамадзянам Беларусі, але і замежнікам, якія змогуць карыстацца імі анлайн, падкрэслілі ў цэнтры. Колькасць сэрвісаў і геаграфія супрацоўніцтва пашыраецца праз кантакты з міжнароднымі партнёрамі. Адпаведныя пагадненні заключаны з аналагічнымі прадпрыемствамі ў Расіі, Малдове, Узбекістане, Казахстане.

Супрацоўнікі НЦЭП стараюцца ствараць праекты і рашэнні, якія можна будзе прэзентаваць на міжнародным узроўні. Так, летась быў арганізаваны першы лічбавы міжнародны форум #GBC *(Дзяржава. Бізнес. Грамадзяне). Па яго выніках адбыўся шэраг рэгіянальных форумаў, падчас якіх прадставілі найлепшыя лічбавыя рашэнні і дасягненні ў розных сферах эканомікі Беларусі: транспарт, прамысловасць, энергетыка, адукацыя. Сёлета ў маі адбудзецца другі міжнародны лічбавы форум #GBC-2022.*

У 2021-м у краіне распрацавалі базу даных замежных студэнтаў. Мяркуецца стварыць цэлы комплекс паслуг па атрыманні замежнікамі вышэйшай адукацыі ў Беларусі, пачынаючы ад падачы заявы на навучанне да рэгістрацыі пасля прыезду ў нашу краіну, падзялілася **Святлана КАРАНЕВІЧ, начальнік аддзела электроннай камерцыі НЦЭП:**

— Сёлета стартуе таксама паслуга па атрыманні электроннай візы на ўезд у Беларусь. Пакуль паслуга тэсціруецца сумесна з МУС і МЗС, неўзабаве далучыцца і пагранкамітэт. Мяркуецца, што іншаземец зможа прад'явіць на граніцы раздрукаваны з партала дакумент з QR-кодам, а мытнік, зверыўшыся з базай, убачыць, што віза сапраўдная.

Неўзабаве з'явіцца і комплексная паслуга для аўтааматараў, якія хочуць набыць машыну, што была ва ўжытку. Яны змогуць прасачыць усю гісторыю «жыцця» аўто: колькасць уладальнікаў, наяўнасць страхоўкі, ці была машына зарэгістравана як таксі, які ў яе прабег і іншае.

У найбліжэйшы час у электронным выглядзе павінна з'явіцца і паслуга па пастаноўцы дзіцяці на чаргу ва ўстанову дашкольнай адукацыі. Мяркуецца, што могуць з'явіцца і суперсэрвісы для рыэлтараў і натарыусаў. Напрыклад, каб здзейсніць «чыстую» здзелку на продаж маёмасці, рыэлтару трэба даслаць запыт хіба што не ў 50 розных месцаў: псіханеўралагічны дыспансер, разліковую сістэму камунальных паслуг і шмат яшчэ куды. А калі гэта будзе рэалізавана на адным партале, спецыялістам стане значна зручней, перакананa спецыяліст.

**Ірына СІДАРОК.**

# «У МАЛЫМ БІЗНЕСЕ НЯМА СЛОВА «ТРЭБА», ТУТ ГУЧЫЦЬ «Я ХАЧУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Да нас прыходзяць бізнесмены-пачаткоўцы з розных прычын. Бываюць сітуацыі, калі разарваліся працоўныя адносіны, чалавек адчувае сябе не патрэбным нікому. Тады няўдача дае старт для новага бізнесу. Вітаем у сябе і моладзь, якая вызначаецца, чым заняцца ў жыцці. Ім мы даём веды для заснавання сваёй справы. Я таксама ўваходжу ў склад Савета па развіцці прадпрымальніцтва пры Мінаблвыканкаме і Мінрайвыканкаме. Там абмяркоўваем праблемы бізнесу. То-бок, у інкубатары мы дапамагаем яго пачаць, а далейшыя праблемы разглядаем на гэтых пляцоўках.

***— Акрамя ментарскай дапамогі вы даяце маладым фірмам і свой «дах»?***

— Так, наша задача — даць за невялікія грошы памяшканне для размяшчэння офіса. Маладыя прадпрыемствы плацяць менш, хто «жыве» даўжэй, — больш. Мы не канкурыруем з буйнымі сталічнымі бізнес-цэнтрамі, бо наш профіль — малы бізнес. Але адчуваем: дзелавыя цэнтры з Мінска, якія пакінулі IT-кампаніі, пачынаюць дэмпінгаваць, даюць памяшканні амаль бясплатна. У нас ёсць адна канкурэнтная перавага — нашы памяшканні невялікія, ад 10 да 35 «квадратаў». У сталічных цэнтрах малому бізнесу прапануюць займаць вялікія лофтавыя прасторы па 600—800 квадратных метраў. Такія плошчы ім не патрэбныя.

***— Як сёння адчувае сябе малы бізнес у Беларусі?***

— Апошнімі гадамі для бізнесу супалі тры выклікі. Першы — каранавірус, які абмежаваў сувязі. Другі — падзеі 2020 года, падчас якіх многія прадпрымальнікі не вызначаліся, як сябе паводзіць. Трэці выклік, што выпрабоўвае і цяпер, — санкцыі. Нашы малыя бізнесы, якія мы «вырошчваем», накіраваны ў асноўным на ўнутраны рынак, таму амаль усе праекты сёння працуюць. Былі праблемы з пастаўкамі камплектуючых, але прадпрымальнікі наладжваюць новыя сувязі і знаходзяць неабходныя для работы кампаненты. Малыя прадпрыемствы працуюць. Людзі занятыя. З'ехала з пачаткам крызісных падзей за мяжу толькі некалькі IT-кампаній, якія працавалі пад крыламі нашага інкубатара. Ніколі мы на IT у сваім інкубатары стаўку і не рабілі. Для іх былі створаны асаблівыя ўмовы ў ПВТ.

***— Калі не на IT-тэхналогіі, на якую сферу малога бізнесу рабілі ўпор?***

— На бізнес, які працуе з праблемамі насельніцтва, накіраваны ў сваёй дзейнасці на малыя пасёлкі, невялікія гарады. На тэрыторыі Мінскага раёна такіх хапае. Нашы бізнесы аказваюць паслугі па абслугоўванні сядзібных дамоў: іх будаўніцтве, рамонце, дызайне (у тым ліку ландшафтным), уладкаванню сантэхнікі, электрыкі, устаноўцы дзвярэй, акон. Мне прыемна для вырашэння сваіх патрэб выклікаць менавіта работнікаў сферы малога бізнесу, бо такім чынам я падтрымліваю яго. Сёння Міншчына ў пытаннях малога бізнесу паказальная, бо складае 70—80 % даходнай часткі бюджэту раёна.

***— То-бок, малы бізнес на вёсцы — гэта сфера паслуг. Чаму прадпрымальнікі не імкнуцца займацца вытворчасцю?***

— Вытворчасць патрабуе значных укладанняў. Малы бізнес імкнецца абыходзіцца сваімі сродкамі, бо банкаўскія фінансавыя рэсурсы «кусаюцца», працэнтныя стаўкі высокія. Пры пагаршэнні сітуацыі на рынку колькасць заказаў памяншаецца, выручка падае, а банкі павышаюць стаўкі крэдытаў. Узнікае крызісная сітуацыя. Апошнія два гады мы назіралі факты неплацежаздольнасці кампаній — узялі залішнія рэсурсы ў банка, не могуць з ім разлічыцца і банкруцяцца.

Сёння для вытворчасці з'явіліся новыя магчымасці. Дзяржорганамі складзены спіс вырабаў, неабходных для імпартазамяшчэння. Такую вытворчасць без падтрымкі заснаваць вельмі складана. Але той жа «Банк Развіцця» прапануе праграмы фінансавага садзейнічання. Ёсць і свае складанасці з імпартазамяшчэннем. Сёння тавар запатрабаваны, магчыма, праз час кантакты адновяцца і неабходнасць у айчынных вырабах адпадзе. Таму становіцца актуальным пытанне абароны ўнутранага вытворцы.

***— Ці варта сёння, у час беспрэцэдэнтных санкцый, увогуле ствараць малы бізнес?***

— У кітайскай мове слова «крызіс» складаецца з двух сімвалаў. Адзін азначае «небяспечнасць», а другі — «шанц». Пра гэта кажуць і ўлады: крызіс — магчымасць заняць новыя рынкі, асвоіць іншыя кірункі. Але ўсё вызначае не толькі час, але і псіхалогія канкрэтнага чалавека. Калі настрой у пачаткоўца пазітыўны і ў яго ёсць пэўныя кампетэнцыі — варта ісці ў бізнес. З'явіліся шматлікія формы прадпрымальніцтва, якіх нават бізнесам не называюць. Я кажу пра самазанятасць, асабістыя падсобныя гаспадаркі, аграсядзібы. Сапраўдны бізнес — гэта вырашэнне праблем спажыўцоў. Калі ёсць вялікія праблемы — значыць, ёсць магчымасці для бізнесу іх вырашыць.

***— З пачаткам крызісных падзей колькасць малых бізнесаў не паменшылася?***

— У малых бізнесах ідзе трансфармацыя. Некаторыя закрываюцца, каб рэарганізавацца ў ІП, зарэгістраваць самазанятасць. Мы назіраем невялікі рост актыўнасці малых прадпрыемстваў з рознымі формамі. Аддзел рэгістрацыі бізнесаў у Мінскім раёне без работы не сядзіць. Яны кажуць, што цяпер няма спаду рэгістрацыі. Змяняюцца толькі прававыя формы бізнесаў.

Па даных аддзела рэгістрацыі бізнесаў Мінскага раёна, пасля Новага года на наш рынак пачалі актыўна прыходзіць расійскія прадпрымальнікі. Яны выкарыстоўвалі адрас нашага інкубатара для рэгістрацыі, але тут нават не з'яўляліся. Мы называем такія фірмы «левымі» ці «аднадзёнкамі». Яны зробяць некалькі аперацый і знікнуць. Каб папярэдзіць такія выпадкі, мы з рэгіструючым органам звяраем, ці з добрымі намерамі бізнес. Калі інвестар сапраўдны, мы з ім знаёмімся, размаўляем, рэкамендуем кірункі. Калі ў яго нейкія нядобрыя задумы, ён імкнецца зрабіць усё хутка, нябачна. Сёння такая хваля сціхла.

***— Якія кірункі для адкрыцця малога бізнесу найбольш актуальныя цяпер?***

— Сёння вытворчасць прадуктаў харчавання з'яўляецца самым запатрабаваным відам бізнесу. Вырошчванне, магчымасці для захавання харчавання, перапрацоўкі, сушкі і гандлю — ёмісты рынак. Рэгіёны, якія зрабілі ў свой час стаўку на гэтую справу, — Столін, Альшаны. Там развітая і маштабаваная вытворчасць агародніны, садавіны.

***— Атрымліваецца, каб зрабіць малы бізнес паспяховым, неабходна нешта вырошчваць?***

— Так, вырошчваць, перапрацоўваць прадукты харчавання ці аказваць паслугі. Мы шмат кажам пра малую вытворчасць, якая магла б быць партнёрам вялікага бізнесу. У перыяд санкцый дадзеная тэма стала асабліва гучаць. Добра было б не шукаць за мяжой нейкія запчасткі, а ствараць іх на нашых малых прадпрыемствах. Цяпер буйныя вытворцы просяць аб гэтым. Тады рабіце стаўку на сваіх, дапамажыце ім развівацца. Каб разгарнуць такі ланцужок, неабходныя час, грошы і гарантыі, што праз два-тры гады са зняццем санкцый нашы малыя вытворцы не памруць. Уладам неабходна заявіць, што мы ставім на сваіх і гарантуем — іх прадукцыя будзе запатрабаваная.

***— Якая сітуацыя сёння з кампаніямі з замежнымі інвестыцыямі?***

— Раней у некаторыя нішы ішлі інвестыцыі з Еўропы. Цяпер яны закрываюцца і з рынку знікае шэраг паслуг, якія выконвалі нашы людзі для Захаду. Гэта як з IT-сектарам. Людзей уключылі ў свае вытворчыя ланцужкі, з'яднаалі з тэхналогіямі, таму іх і вывозяць. Паслугі, з замежнымі інвестыцыямі, якія выкарыстоўваліся на нашым рынку, сыходзяць, але людзі з кампетэнцыямі засталіся. Неабходна знайсці форму падтрымкі супрацоўнікаў такіх кампаній.

Сёння стаіць пытанне аб неабходнасці стварэння айчыннай грантавай сістэмы для бізнесу, каб развіваць рэгіёны. У нас ёсць фонд падтрымкі прадпрымальнікаў, які выдае пазыкі бізнесу пад стаўку рэфінансавання, але попыт на сродкі значна перавышае прапанову. Ёсць банкі, але малому бізнесу яны даюць крэдыты пад вялікія працэнты. Свае нацыянальныя рэсурсы нам неабходныя, каб пад задачы, якія ставіць дзяржава, ішлі грошы. Нацыянальная сістэма малых грантаў і грантаў для прадпрымальнікаў-пачаткоўцаў, асабліва ў рэгіёнах, была б выдатным праектам. А мы — інкубатары, цэнтры падтрымкі прадпрымальніцтва, тэхнапаркі — падставілі б плячо.

***— Як вы ставіцеся да тэндэнцыі рэлакацыі высокакваліфікаваных спецыялістаў?***

— Мяне вельмі расчароўвае, калі людзі кажуць, што не бачаць іншай магчымасці, акрамя як з'ехаць у Польшчу ці Германію. Наш інкубатар працуе з усім светам, таму мы ведаем замежныя сістэмы падтрымкі бізнесу. Дзяржава там сапраўды моцна падтрымлівае новы бізнес. Але для гэтага неабходна выканаць шмат умоў. Па-першае, калі ты прыехаў і кажаш, што хочаш пачаць бізнес, цябе паставяць у чаргу — такіх шмат. Па-другое, калі вы нешта ўмееце і хочаце пачаць займацца гэтым у заходняй краіне, у вас будзе ў дзесяць разоў больш канкурэнтаў, чым у Беларусі. У нас больш закрытая эканоміка, і на чым заўгодна можна рабіць бізнес. Самы свабодны рынак на Захадзе — гэта прыборка, сацыяльнае абслугоўванне і дастаўка. Ці гатовы спецыяліст з вопытам займацца прыборкай ці дастаўкай піцы? Калі так, паспрабуй, з'ездзі. Непрыемна, калі чалавек страціць час, бо таго ўзроўню, якога дасягне там, ён дасягнуў бы дома хутчэй. Час выклікаў на кожнага ўплывае па-свойму. Хтосьці лічыць, што не справіцца, тут няма нічога добрага — і паехаў. Гэтая хваля цяпер накрывае, але яна не новая.

***— Якімі якасцямі павінен валодаць чалавек, які хоча адкрыць уласную справу?***

— Чаго нам сёння не хапае ад людзей — аптымізму. Любая праблема можа быць пачаткам шляху да поспеху. Любая паспяховая стратэгія канцэнтруецца на магчымасцях, а не праблемах. І калі да мяне прыходзіць чалавек з жаданнем бізнесам вырашыць сваю праблему, мы спачатку абмяркоўваем яе, бо магчыма для гэтага не варта ствараць фірму. У малым бізнесе няма слова «трэба», тут гучыць «я хачу». І калі чалавек кажа: «Я хачу паспрабаваць» — гэта наш чалавек.

Любы бізнес павінен грунтавацца на прадпрымальнасці. Калі мы навучылі бізнесмена, напхалі яму разнастайных ведаў, а гэтай якасці ў яго няма, нічога не атрымаецца. Прадпрымальны чалавек будзе запатрабаваны ўсімі: і прыватным бізнесам, і дзяржавай. Неабходныя толькі механізмы падтрымкі такіх людзей. Калі чалавек не самарэалізаваўся, ён пачынае шукаць шляхі для гэтага недзе там, за мяжой, быццам бы «там» больш магчымасцяў для самарэалізацыі. Там толькі верагоднасць сутыкнення з падобнымі да цябе вышэйшая, а механізмы самарэалізацыі ўсюды аднолькавыя.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ

## Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ правёў урок памяці ў школе № 28 Віцебска

**Уладзімір Пярцоў правёў урок памяці ў сваёй роднай школе, якую скончыў з сярэбраным медалём. Падчас дыялогу з вучнямі міністр расказаў пра генацыд нашага народа ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Ён заўважыў, што сёння многія імкнуцца перайначыць гістарычныя факты, прынізіць подзвіг савецкага народа, таму галоўная задача бацькоў і настаўнікаў — дапамагчы моладзі адасобіць праўду ад іншага інфармацыйнага шуму. І гэта, калі меркаваць па падлетках, якія выхаваны на патрыятызме, атрымліваецца.**

— 9 Мая — адно з галоўных свят Беларусі. Мы захавалі яго пасля распаду СССР, калі пад уплывам заходніх калег лічылася недарэчным успамінаць, што рабілася на гэтай зямлі ў 1941—1944 гадах. Яны спрабавалі пераканаць нас, што трэба забыцца аб тых страшных падзеях і Перамозе. Рабілі гэта для таго, каб нівеліраваць злачынствы сваіх продкаў і дзяржаў у ваенны перыяд, прынізіць ролю Савецкага Саюза ў разгроме фашызму, каб мы не адчувалі сябе патомкамі пераможцаў, — адзначыў Уладзімір Пярцоў.

2022 год асаблівы — Год гістарычнай памяці. Сёння, калі амаль не засталося жывых сведкаў ваенных ліхалеццяў — ветэранаў, маладое пакаленне павінна трымацца за кожную магчымасць, каб ведаць праўдзівыя факты Вялікай Айчыннай, зразумець, каго лічыць сапраўднымі героямі, а потым перадаць гэтую памяць сваім дзецям. Бо вайна можа паўтарыўцца зноў, калі чалавецтва пра яе забудзе.

Напрыканцы мерапрыемства школьны тэатр паказаў спектакль «Нелюдзі», аўтарам якога і выканаўцам галоўнай ролі стаў адзінаццацікласнік Багдан Кузьмін.

— Інфармацыя лепш засвойваецца моладдзю ад аднагодкаў, і спектакль — яркі таму доказ, бо, гледзячы на ўстрывожаныя вочы прысутных, відаць, што пастаноўка моцна іх уразіла, — заключыў міністр.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Клопат

# ПЕРАГЛЕДЗЕЦЬ МЕХАНІЗМЫ ПРЫЗНАЧЭННЯ ДАПАМОГ І ПАТРЭБЫ Ў САЦПАСЛУГАХ

## Што мяркуецца змяніць у сістэме сацыяльнага абслугоўвання?

**Дэпутаты Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях на чале са старшынёй Людмілай КАНАНОВІЧ правялі выязное пасяджэнне на базе Дзяржынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Паколькі сёлета плануецца падрыхтаваць змены ў законы па пытаннях сацыяльнага абслугоўвання, парламентарыі выязджаюць у рэгіёны і на месцах знаёмяцца з пералікам сацыяльных паслуг, іх запатрабаванасцю, выслухоўваюць прапановы ад саміх сацыяльных работнікаў і грамадзян, якія маюць патрэбу ў такіх паслугах.**

### Другі дом для пажылых

Дзяржынскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання быў абраны пляцоўкай для абмеркавання гэтых пытанняў невыпадкова. Як адзначыла Людміла Кананові, гэта ўнікальны цэнтр для пажылых грамадзян і іншых уразлівых катэгорый насельніцтва, які надзвычай запатрабаваны і, па сутнасці, стаў для іх другім домам. Цэнтр — адзіны на Міншчыне, які размешчаны не ў прыстасаваных памяшканнях, а ў пабудаваных па сучасным праекце. Чатырохпавярховы будынак быў узведзены за 1,5 года і адчыніў свае дзверы для наведвальнікаў 1 верасня 2021 года. Утульныя памяшканні для заняткаў і спорту, творчыя майстэрні, пункт пракату тэхнічных сродкаў рэабілітацыі, актавая зала — усё гэта стала для жыхароў Дзяржынска і раёна ўлюбёным месцам, дзе яны з задавальненнем праводзяць час.

Не пустуюць у цяперашні час і крызісныя пакоі — у адным з іх пражывае сям'я ўкраінскіх бежанцаў. Таццяна з дачкой прыехалі з Марыупаля ў Беларусь тыдзень таму.

— Наш дом разбураны, і нам няма дзе жыць. Хаваліся некалькі тыдняў у падвалах.

Родам з Беларусі зяць Таццяны, і ў лютым ён паехаў па справах на радзіму, збіраўся вяртацца, але не паспеў. Пры першай магчымасці жонка і яе маці выехалі да яго, так і апынуліся ў Дзяржынску. У мірным жыцці Таццяна працавала медсястрой. Збіраецца і цяпер шукаць працу, калі вырашацца пытанні з жыллём.

— Паколькі ва Украіне нам цяпер няма дзе жыць, будзем уладкоўвацца ў Беларусі, — кажа жанчына. — Самае галоўнае — што мы выжылі. І вялікі дзякуй, што прынялі нас.

Пастаяннымі наведвальнікамі цэнтра з'яўляюцца пажылыя людзі, а таксама інваліды, пераважная большасць з іх — моладзь.

— Штодзень у цэнтры збіраецца каля 80 наведвальнікаў, — расказвае **дырэктар Дзяржынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання Вікторыя РАМАНОВІЧ.** — Усяго мы абслугоўваем каля 20 тысяч чалавек, з іх 10 тысяч — непрацаздольныя. Каля 700 чалавек маюць патрэбу ў дапамозе сацработнікаў дома.

### Праблемы пажылых і сэндвіч-пакалення

Падчас пасяджэння Людміла Кананові звярнула ўвагу, што на 2022 год запланавана ўнясенне ў Палату прадстаўнікоў законапраекта «Аб змяненні законаў па пытаннях сацыяльнага абслугоўвання». Створана рабочая група, якая працуе над дакументам.

— Цяпер надышоў час, што называецца, зверыць гадзіннікі. Мы павінны паглядзець, як працуюць рэгіёны, што мы павінны захаваць, а што трэба змяніць, якім мусіць быць заканадаўства, каб яно было простым і зразумелым, абмеркаваць праблемы, якія ёсць, для таго, каб іх можна было вырашыць, фарміруючы нормы заканадаўства на этапе падрыхтоўкі, — адзначыла старшыня камісіі.

Пытанні змен, якія патрабуюцца ў новым заканадаўстве, закранула падчас пасяджэння **намеснік міністра працы і сацыяльнага абслугоўвання Марына АРЦЁМЕНКА.** Яна звярнула ўвагу на праблему старэння насельніцтва, характэрную для многіх краін свету.

— Нягледзячы на тое, што Беларусь пакуль уваходзіць у трэць маладых краін (у нас 16 % насельніцтва ва ўзросце 65+), да 2030 года кожны пяты беларус будзе ва ўзросце 65+. Ужо цяпер сярод пажылых людзей кожны чацвёрты ва ўзросце 80+. Многія беларусы належаць да так званага сэндвіч-пакалення, якія заціснуты абставінамі: з аднаго боку, ім варта клапаціцца пра пажылых бацькоў, з іншага — пра яшчэ не дарослых дзяцей. І сумяшчаць гэта з інтэнсіўнай працоўнай дзейнасцю. Сіндром сэндвіч-пакалення нельга пераадолець, але можна аблегчыць задачу — стварыць такія ўмовы, каб гэты клопат быў пасільны.

Сістэма сацыяльнага абслугоўвання ў Беларусі выбудавана. Гэта ў тым ліку і 146 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, яны дзейнічаюць у кожным адміністрацыйным раёне. Самыя запатрабаваныя сацыяльныя паслугі — дапамога сацыяльных работнікаў і сядзелак дома. Такія паслугі атрымлівае каля 100 тысяч грамадзян. Каля 153 тысяч пажылых людзей і інвалідаў з'яўляюцца наведвальнікамі цэнтраў. Апошнім часам пажылых людзей даглядаюць у замяшчальных сем'ях — 321 беларус сталага веку знайшоў такім чынам сабе дапамогу і блізкіх людзей.

Для тых, хто не можа абслугоўваць сябе дома, працуюць дамы-інтэрнаты. За апошнія гады іх дзейнасць істотна змянілася: дадаліся новыя паслугі, рэабілітацыя, сацыяльны догляд, у тым ліку і людзей з дэменцыяй.



Заняткі ў творчай майстэрні Дзяржынскага ТЦСАН.

— Дамы-інтэрнаты становяцца шматфункцыянальнымі і камфортнымі. І гэта вельмі важна, калі яны мала чым адрозніваюцца ад хатніх умоў, бо чалавеку заўсёды лепш дома, — адзначыла намеснік міністра.

### Кожнаму па патрэбах

Яна падкрэсліла, што цяпер падыходы да патрэбы ў сацыяльных паслугах заснаваны на медыцынскай мадэлі і галоўную ролю адыгрывае дыягназ чалавека. А ў дом-інтэрнат часта змяшчаюць людзей, якія яшчэ доўга маглі б знаходзіцца дома.

— Сёння ўтрыманне ў інтэрнаце абыходзіцца ў 1200—1300 рублёў, паслугі сядзелкі і сацыяльнага работніка, які можа наведваць гэтага чалавека дома, значна таннейшыя, — прывяла лічбы Марына Арцёменка.

Гэты механізм будзе перагледжаны. У новым законапраекце прапануюць замацаваць такі падыход, калі аб'ём сацыяльнай дапамогі будзе адпавядаць рэальным патрэбам канкрэтнага чалавека, улічваючы яго ўласныя магчымасці. Будзе выкарыстоўвацца механізм ацэнкі праз набор сацыяльных паказанняў, у выніку кожны чалавек атрымае індывідуальны набор сацыяльных паслуг, што дазволіць больш эфектыўна расходаваць бюджэтныя сродкі.

Плануецца перагледзець і падыход прызначэння дапамогі асобам, якія ажыццяўляюць догляд інвалідаў і асоб, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту.

— Сёння такую дапамогу могуць атрымліваць толькі працаздольныя непрацоўныя асобы. Яе памер невысокі — 296 рублёў. Плюс перыяд догляду не ўключаецца ў страхавы стаж — чалавек трапляе ў пенсіённую пастку, — тлумачыць Марына Арцёменка.

Новы падыход будзе іншы: час догляду будзе аплачвацца і залічвацца ў працоўны стаж. Увогуле, такі догляд будзе разглядацца як сацыяльная паслуга, якая мусіць быць аплачана. Перагляду патрабуе і аплата знаходжання ў дамах-інтэрнатах. Сёння, незалежна ад узроўню камфортнасці, 90 працэнтаў ад пенсіі пажылога чалавека ідзе ў лік такой аплаты. Мяркуецца змяніць і саму назву — дом-інтэрнат для састарэлых. Магчымыя варыянты — сацыяльны пансіянат ці дом догляду.

Пра інавацыйныя падыходы ў рабоце сацыяльных устаноў Мінскай вобласці расказала **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Тамара КРАСОЎСКАЯ.** Яна адзначыла, што ў рэгіёне працуе 23 тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, 23 дамы-інтэрнаты. Сацыяльныя паслугі атрымлівае 32 тысячы чалавек, з іх 22 тысячы — дома. Будаўніцтва сучаснага тэрытарыяльнага цэнтра Мінскага раёна плануецца ў Бараўлянах. Там размесцяцца асноўныя аддзяленні цэнтра, працоўныя майстэрні, трэніровачная кватэра для інвалідаў, актавая і канферэнц-залы. Ужо зацверджаны праект, будаўніцтва плануецца завяршыць за год.

— Нас вельмі падтрымлівае губернатар Мінскай вобласці Аляксандр Турчын, няма ніводнай сацыяльнай установы, дзе б ён не пабываў. З яго падтрымкай нашы пытанні вырашаюцца вельмі аператыўна, — адзначыла Тамара Красоўская.

Людміла Кананові рэзюмавала, што ўнесеныя прапановы будуць разгледжаны і ўлічаны і, безумоўна, паслужаць далейшаму ўдасканаленню заканадаўства ў галіне сацыяльнага абслугоўвання.

**Алена КРАВЕЦ,**
*г. Дзяржынск.*

**фота аўтара.**

Па сутнасці

# ГІМН ЖЫЦЦЮ



**...Каяфа старанна паціраў рукі. Не, не як Пілат. Пілат... Гэты чыстаплюй — ісціну хацеў знайсці. Гэтага дзівака з Назарэта хацеў адпусціць. Чыстаплюй. Так. Але больш Пілат баязлівец. Зразумеў, што можа страціць уладу. Улада. Вось — ісціна! Каяфа гэта ведае лепш за законы Машэ. «Каяфа — ты нават лепей за Машэ» — усё мацней и мацней у галаве Каяфы шыпелі парады старадаўняга змея. Машэ. Той вымушаны быў утаймоўваць дзікую сілу натоўпу. А Каяфа — гэтую сілу вельмі зручна накіроўвае на сваю карысць. Гэта Іардан не можа змяніць цячэнне, а Каяфа — можа змяніць гісторыю. Вось хто сапраўдны цар іудзейскі. Гэта я — Каяфа! Больш нікога Каяфа не чуў. Толькі шыпенне старадаўняга змея.**

...Каяфа старанна паціраў рукі. Так патрэбна. Так правільна. Закон маем і па законе робім. Гучаў у памяці лямант натоўпу. «Разапні яго, разапні». Распялі. Кропка. Наперадзе — святочная вячэра. Вялікдзень. Такога Вялікадня духоўныя ўладары іудзейскага народа яшчэ не адзначалі. Гэта сапраўдная перамога. Нават і падумаць нельга, як сустракалі таго прастака. Усё, больш не будзе неспадзяванак. Цела ў пячоры, закрытай валуном. А яшчэ і пад аховай. На валуне пячатка. Пячатка ўлады Каяфы. Ісціна... Хітрая ўсмешка павольна з'явілася на твары Каяфы. Наперадзе — Сэдар. З новым сэнсам. Перамогай над Распятым.

...Трызну спраўлялі ў адным з найбагацейшых дамоў Манхэтана. Гэта — смерць Саветаў. Пачатак канца. Цяпер галоўнае — пасеяць больш панікі. Увесь свет павінен лямантаваць аб слабасці Чырвонай імперыі. Нарэшце ўсе забудуць аб Хірасіме і Нагасакі. Чарнобыль — вось тэма нумар адзін. Чаму адбылася аварыя, ці хто калі адкапае ісціну. Тая ісціна пад графітавымі абломкамі. Ісціна — у тым, што наша Амерыка будзе яшчэ больш вялікай.

...Трызну эксперты міжнароднага ўзроўню спраўлялі і па Беларусі. Некаторыя дзяржавы нават надрукавалі палітычныя карты свету, дзе замест назвы Беларусь — белая пляма. Попел Чарнобыля сапраўды шчодра пасыпаў зямлю беларускую. Нібы цукар у чай, сыпаліся радыенукліды ў Прыпяць, асядалі на самабытнае Палессе, багатыя землі Гомельшчыны... Не абмінула бяда нават самыя аддаленыя мястэчкі Беларусі. Супраць ядавітых аблокаў паўстала авіяцыя, як маглі, збівалі... На тэрыторыі Беларусі. Магілёўшчына. Навала тая прыйшла з іншай краіны, а засталася ў нас. Хатынь ды Верхнія Жары — аднолькава балюча адгукаюцца ў сэрцы кожнага беларуса гэтыя назвы. Чаму? Кожны трэці загінуў у вайну, трэць нашай тэрыторыі ў той ці іншай ступені закранула чарнобыльская трагедыя. Няўжо тое галгофскі крыж Беларусі?!

Чарнобыль — таксама наша гісторыя. А сама «зона» прыцягвае бы магнітам. Як гіблае месца, дзе жывуць вядзьмаркі, — і страшна, і цікава. Хоць іх не бачыш. Як і радыяцыю. Я некалькі разоў быў у «зоне». Шмат цікавых людзей сустракаў. Нават сваім, у той час дзіцячым, сэрцам перажыў гэтую трагедыю. Не раўнадушны, маю права пісаць. Як той казаў, можаш не пісаць — не пішы. Я не магу не пісаць пра Чарнобыль.

Ізноў вайна? Няўжо? Нябачны вораг. Паліў людзей знутры. Раніў у самае сэрца. Насамрэч вайна. З эвакуацыяй, ахвярамі, героямі, злачынцамі. «Бяда» — так самую вядомую тэхнагенную катастрофу і называюць старэйшыя людзі ў тых мясцінах. Бо моладзь пра тыя падзеі ці чула, ці чытала, калі чытае. Цяпер моладзь пра тое даведваецца праз аднайменны фільм. Іншаземны, на жаль.

Пра бяду сёння ў Брагіне, Нароўлі нагадваюць помнікі. З трыма трохвугольнікамі, звязанымі паміж сабой у адным крузе. Гэта сімвал радыяцыі. Рыжыя дажджы, лысыя дзеці... І салдаты ў рэспіратарах з рыдлёўкамі супраць цэзію, стронцыю. Нябачнага ворага.

...Кажуць, хтосьці нажыўся на той бядзе. Былі такія? На жаль. Функцыянеры, што прысвойвалі дзяржаўныя грошы на пераадоленне наступстваў, махляры, што прысвойвалі сабе «корачкі» ліквідатараў, а таксама марадзёры, што гандлявалі асабістымі рэчамі, матацыкламі, маторкамі і нават проста дошкамі з траскучым бэкграўндам. Але аб гэтым досыць. Некаторыя аўтаркі, лаўрэаткі, нобелеўкі гэтым брудам запэцкалі ўсю літаратурную прастору. Трэнд нарадзіўся. Смакавалі, як пакутліва паміраюць дзеці Чарнобыля, як прыкра ставіліся да жывых — маўляў, не хацелі ехаць у адным купэ ці сядзець за адной партай... Мо і такое было. Людзі розныя. А мне за маіх землякоў не сорамна. На захадзе Брэстчыны да перасяленцаў ставіліся спагадліва. Хто чым мог, тым і дапамагаў. Неслі адзенне, сала, нават квахтух з яйкамі...

А ў Мінску, абласных гарадах з'яўляліся цэлыя кварталы, у райцэнтрах — дамы для перасяленцаў. У гарадах такіх людзей у шматкватэрныя дамы сялілі цэлымі вёскамі. На вёсцы — шчодра надзялялі самымі ўрадлівымі землямі. То быў час фермерскай моды. На работу таксама ўладкоўвалі на самыя прэстыжныя пасады. Зразумела, улічваючы здольнасці і веды. А ў той час дэфіцытнае тлустае малако пацярпелым выдавалі скрынямі.

А пісалі пра дрэннае: то былі апошнія дні савецкай імперыі. Тады лаяць усё савецкае было модна. А крытыка заўжды больш прыцягальная. А мо і выгадная. Напэўна, Нобель і ўявіць не мог, што яго вялікая ідэя падтрымкі Яе Вялікасці Навукі будзе некалі зняважана да сэнсу 30 срэбранікаў. Даваць будуць не за вынаходніцтва, а за... крытыку. А яшчэ лепей, калі тая крытыка прасоленая слязамі людзей. Па памерлых сынах і мужах, па страчанай бацькаўшчыне... Так, сучаснай палітызаванай літаратуры патрэбен не герой, а слабы чалавек, чалавек, які падпарадкоўваецца сваім жарсцям, чалавекфобія. Чалавек, які заўжды скідвае з плеч свой галгофскі крыж. Ну, пра гэта ёсць каму пісаць. Я вось аб сапраўдных героях. Пра нашых землякоў, што не схіляюць галаву перад цяжкасцямі. Васіль Ігнаценка — беларус. Ці, лепей сказаць, з нашых мясцін. Сваім целам літаральна засланіў свет ад чарнобыльскага попелу. Вось такія — сапраўдныя савецкія людзі. Пажарныя, акадэмікі, сотні і тысячы ліквідатараў. Чаму аб іх так сціпла пішам, чаму толькі з нагоды згадваем? Чаму іх не запрашаюць на школьныя ўрокі мужнасці? Можа, тады дзеці і моладзь Беларусі была б уражана не галівудскай папсой, а сапраўднымі, нашымі, людзьмі.

Пра герояў сёння не так чытаюць. Калі гэта не героі далёкіх планет. Стоп. Навошта беларусам героі? Беларусы павінны, панура звесіўшы галаву, плесціся на пагост. Менавіта для гэтага і прыдумалі той «Чарнобыльскі шлях». Ды як сімвалічна! У Курапаты. На пагост. Шэсце ў смерць. Ці не пра такую грамаду пытаўся Купала: «А хто там ідзе?». На жывой ране беларусаў, на іх пачуццях рабілі сабе імёны ў літаратуры і палітыцы. У той час з Авальнай залы толькі і было чуваць доўгія стогны пра Чарнобыль. Але ці хто з гэтых гарлапанаў з'ездзіў туды, сустрэўся з людзьмі? Калі і ехалі, то толькі са сваімі прадуктовымі наборамі, што ў пачатку 1990-х атрымаць можна было з чорнага хода. А вось каб прывітацца, пацiснуць руку тутэйшым — ЧАРНОБЫЛЬЦАМ — якое! Хутчэй назад — у сталічныя кватэры. Праўда, знайшоўся адзін такі дэпутат, што ездзіў у пацярпелыя раёны не па разнарадцы. Ён і сёння ездзіць туды. Кожную вясну ў канцы красавіка, нават лецішча ўладкаваў на тых землях. Гэта стала ўжо традыцыяй. Таго дэпутата ўся Гомельшчына падтрымала на выбарах прэзідэнта. І заўжды падтрымлівае. Гэта таксама традыцыя. Чаму? Бо ён вярнуў людзям надзею, жыццё на іх родныя землі, на іх бацькаўшчыну. Кажуць, менавіта тут упершыню і прагучала: ён — не прэзідэнт, ён — Бацька. Вядома, акрамя яго, так клапатліва ніхто з уладароў ні савецкіх, ні «свядомых» не ставіўся да гэтых земляў і гэтых людзей.

Аб іх успаміналі, калі было патрэбна. Нібыта жабрак, працягнуць руку за заходняй падачкай. Гэта трэба ўцяміць: навіной нумар адзін была любая пашарпаная «хуткая», што спісвалі ў Беларусь «шчодрыя» заморскія спонсары. Разумееце, якую ролю нам адвялі? Ролю дзяржавы спісанага аўтапарка. Паношанае аддзенне, брудныя цацкі. У абмен на нашых дзяцей, якіх вывозілі ў Еўропу. Я думаю, патрыятызму ў адносінах да Беларусі іх там насамрэч не вучылі... Сёння чарнобыльскія раёны дыхаюць на поўныя грудзі.

Апісаць хараство можна. Але лепей з'ездзіць і паглядзець. Дарэчы, на радзіму вяртаюцца людзі з самых спрыяльных умоў. Пакінулі сталічныя кватэры — і дамоў. Таму сёння на гэтых тэрыторыях неабходна ствараць новыя рабочыя месцы. Вось так. А раней жа думалі, што тая зямля ператворыцца ў радыяцыйны запаведнік. А цяпер я раю падлічыць, колькі грошай чарнобыльская навала ўкрала з беларускай дзяржаўнай скарбонкі. Колькі бюджэтаў. Як той казаў, загугліце і запомніце. Дарэчы, варта стварыць тут музей пра тую Катастрофу. Якая не змагла знішчыць, ператварыць у прах нашу Беларусь.

...Каяфа страціў сон і спакой. Тое, што ён чуў, неверагодна. Вядома, яго вучні маглі б што заўгодна прыдумаць, але ж варта!!! Ну, за маўчанне ім заплацілі. Але ж сябе не падманеш. Якую цану даць свайму сумленню, каб яно маўчала? Што такое ісціна?! У вушах звініць: Хрыстос Уваскрос!!!

...Жыццесцвярджальныя словы разам з велікодным звонам трыумфальна разносяцца па ўсёй зямлі беларускага Чарнобыля. Высокія ноты пераходзяць у працяглы старадаўні спеў жанчын з Камарына і Казлоў. Гімн жыццю гучыць і ў мураваных храмах блізкіх райцэнтраў, і ў драўлянай старажытнай царкве ў Вербавічах. Вачамі-вокнамі званіцы яна, як і раней, углядаецца ў будучыню нястрачанай Бацькаўшчыны.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# Палёт фантазіі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вёска Сцёхава пачынаецца з прыгожага дома, нібыта ён адмысловая візітоўка населенага пункта. Не сумняваюся: кожны, хто праязджае па дарозе Круглае — Бялынічы, звяртае ўвагу на падворак, дзе ўзвышаецца франтон з птушкамі-лебедзямі, а на вокнах — скрозь ажурныя ліштвы з арніталагічнымі сюжэтамі. Адразу відаць, што тут жывуць цікавыя да жыцця і прыроды гаспадары. Які творчы падыход да афармлення сваёй жыллёвай прасторы! Так і хочацца спыніцца, зрабіць фота, сустрэць гэтых майстроў-мастакоў. І я не ўстрымаўся, спыніўся каля варот з мазаікай. На ўдачу, гаспадары былі дома, і мне пашчасціла зрабіць невялікі экскурс па падворку. А гідам быў сам майстар — Валерый Салымскі. Сваімі рукамі ўжо











болей як дзесяць гадоў ён выразае з дрэва і птушак, і жывёл, упрыгожвае імі вокны. Упрыгожвае і франтоны, і агароджы, і сцены, робіць тратуарную плітку, абрамляе клумбы з пустых бутэлек і камянёў. Валерый Аляксеевіч цяпер на пенсіі, часу хапае, а ўжо задум колькі!? Яго творчыя планы па ўпрыгожванні сядзібы ўхваляе яго палавінка — жонка Валянціна: ёй падабаецца, што звычайную сялянскую хату муж ператварае ў сапраўднае птушынае гняздзечка, у якім жывуць любоў, павага...

Раней Валерый і Валянціна жылі ў Магілёве. Ён быў наладчыкам абсталявання на камбінаце шаўковых тканін, яна — кухарам, але сапраўдную асалоду да жыцця адчулі, калі вярнуліся на радзіму.

**Анатоль КЛЯШЧУК,**
**фота аўтара.**

Чытач — газета

# СУСЕДСКІЯ РАЗБОРКІ, або Яшчэ раз аб карысці добрых стасункаў

**Прыкладаў, калі ўладальнікі суседніх участкаў псуюць жыццё адзін аднаму, мноства. І сярод галоўных прычын сварак з суседзямі ў прыватным сектары — будаўніцтва з парушэннямі нормаў і правілаў.**

Дыстанцыя да межаў суседскага ўчастка, а таксама да будынкаў на ўчастку суседзяў — тая норма, якой часам не надаюць значэння пры ўзвядзенні пабудоў. І менавіта яна вельмі часта становіцца прычынай спрэчак і сварак. Часцей за ўсё з такімі парушэннямі ўзводзяцца будынкі так званага гаспадарчага блока — гаражы, адрыны і лазні.

## АСАБІСТЫЯ МЕЖЫ

«Сусед на адлегласці 2 м 30 см ад вокнаў майго жылога дома ўзвёў гаспадарчую пабудову, — піша ў «Звязду» Таццяна Іосіфаўна, якая жыве на вуліцы Нагорная ў Бабруйску. — У маім доме цяпер пастаянны паўзмрок. За два метры ад маіх вокнаў знаходзіцца суседскі комін, і дым дасягае майго жылога дома».

«Гаспадарчая пабудова, якую ўзвёў сусед, даўжынёй 18 м і вышынёй 5 м», — працягвае чытачка. — У дождж вада льецца з даху суседскай пабудовы патокам у акно маёй кухні». Таццяна Іосіфаўна просіць рэдакцыю і мясцовыя ўлады прымусіць суседа аднесці гаспадарчую пабудову на прадугледжаную законам адлегласць 6 м ад вокнаў яе дома.

**Бываюць выпадкі, калі гаспадары суседніх участкаў, пачынаючы іх забудоўваць, адначасова ж пачынаюць пісаць адзін на аднаго скаргі.**

У сваёй бядзе чытачка не адзінокая. Суседскія адрына або лазня, што ўскладняюць жыццё, — адна з тых праблем, якую ўладальнікі зямельных участкаў часта абмяркоўваюць на форумах. Нават суседскі дом у «няправільным месцы» аказваецца менш распаўсюджанай праблемай.

«За метр ад майго ўчастка сусед пабудаваў лазню з мансардай над ёй — агульная вышыня будынка 6 м (іншымі словамі, такая лазня па памерах, бадай, не саступае жыламу дому). Будынак вельмі моцна зацяняе мой участак. Як я магу паўплываць на суседа і змяніць сітуацыю?» — пытанне ад уласніка зямельнага ўчастка пад Заслаўем.

Бываюць выпадкі, калі гаспадары суседніх участкаў, пачынаючы іх забудоўваць, адначасова ж пачынаюць пісаць адзін на аднаго скаргі. Ідуць праверкі, збіраюцца камісіі, выяўляюцца парушэнні, на абодвух участках будаўніцтва прыпыняецца... У выніку справа даходзіць да суда. Між тым замест гэтага можна было будавацца ў адпаведнасці з устаноўленымі нормамі або, калі па якіх-небудзь прычынах гэта немагчыма (напрыклад, з-за асаблівасцяў зямельнага ўчастка), дамовіцца, вырашыць пытанне палюбоўна і даць адзін аднаму пісьмовую згоду.

Іншыя распаўсюджаныя прычыны зваротаў і скаргаў уладальнікаў прысядзібных і дачных участкаў — пытанні водаадвядзення, а таксама ўстанаўленне межаў участка. Гэтыя сітуацыі таксама ўзнікаюць з-за таго, што гаспадар, з аднаго боку, засяроджаны толькі на ўласнай праблеме (хоць у тых жа пытаннях водаадвядзення часам скааперавацца з суседзямі было б танней, не кажучы ўжо пра адсутнасць неабходнасці выступаць у судзе ў якасці адказчыка), з другога — думае толькі пра сённяшні момант. Але ж зямлю, цалкам магчыма, з часам вы захочаце прадаць, і тады парушэнні межаў участка, якія заставаліся незаўважанымі раней, могуць стаць праблемай. Напрыклад, калі ваша гаспадарчая пабудова часткова стаіць на тэрыторыі суседскага ўчастка.

Калі ліквідаваць непаразуменне з суседам палюбоўна не ўяўляецца магчымым, прыйдзецца звяртацца па абарону сваіх правоў у адпаведныя дзяржаўныя органы — для пачатку ў раённую адміністрацыю.

— Работа са зваротамі грамадзян забяспечвае абарону правоў і законных інтарэсаў чалавека, спрыяе павышэнню якасці жыцця, — тлумачыць **адвакат Мінскай абласной калегіі адвакатаў Алена ГРОНСКАЯ**. — Звароты (індывідуальныя або калектыўныя заявы, прапановы, скаргі, выкладзеныя ў пісьмовай, электроннай або вуснай форме) падлягаюць разгляду ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб». Пісьмовыя звароты лічацца разгледжанымі па сутнасці, калі разгледжаны ўсе выкладзеныя ў іх пытанні, прынятыя належныя меры па абароне, забеспячэнні рэалізацыі, аднаўленні правоў, свабод і (або) законных інтарэсаў заяўнікаў і ім накіраваны пісьмовыя адказы. Пісьмовыя адказы павінны быць абгрунтаванымі і матываванымі (пры неабходнасці — са спасылкамі на нормы актаў заканадаўства), утрымліваць канкрэтныя фармулёўкі, якія аспрэчваюць або пацвярджаюць доказы заяўнікаў, а таксама інфармацыю аб прынятых мерах у выпадку прызнання скаргаў абгрунтаванымі.

Нагадаем таксама, што, калі адказ не задаволіў заяўніка, звяртацца ў дзяржаўныя органы і ў суд можна неаднаразова.

Пры гэтым важна разумець, што заканадаўства мяняецца. Перад пачаткам любога маштабнага будаўніцтва (у тым ліку ўзвядзення гаспадарчых пабудоў) на ўласным участку варта азнаёміцца з апошнімі зменамі, а таксама пракансультавацца са спецыялістамі, якія валодаюць ведамі ў галіне будаўніцтва і нормаў зямельнага заканадаўства.

## НОРМЫ І ПРАВІЛЫ

— Грамадзяне, якія ажыццяўляюць вядзенне асабістай падсобнай гаспадаркі, маюць права ўзводзіць ва ўстаноўленым законам парадку гаспадарчыя будынкі і збудаванні, неабходныя для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, на зямельных участках, выдзеленых для гэтых мэт у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб ахове і выкарыстанні зямель, — каментуе адвакат Алена Гронская.

Гаспадарчая пабудова — гэта аднапавярховы будынак і збудаванне нежылога прызначэння, размешчанае на прысядзібным участку і прызначанае для абслугоўвання домаўладання і зямельнага ўчастка (хлеў для ўтрымання жывёлы і птушкі, адрына для захоўвання гаспадарчага інвентара і паліва, гаспадарчы навес, летняя кухня, гараж, лазня, цяпліца, склеп, летні душ, прыбіральня, месца складавання гною і інш).

— У адпаведнасці з п. 6.3.13 пастановы Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь ад 27 лістапада 2020 г. № 94 «Аб зацвярджэнні і ўвядзенні ў дзеянне будаўнічых нормаў СН 3.01.03-2020» (у рэд. пастановы Мінбудархітэктуры ад 18.01.2022 № 3), адлегласць ад вокнаў жылых памяшканняў жылога дома да сцен дома і гаспадарчых пабудоў, за выключэннем пабудоў для ўтрымання жывёл, а таксама пляцовак (навесу) для размяшчэння асабістага транспарту, размешчаных на суседніх (сумежных) зямельных участках, павінна складаць не менш чым 6 м. Узвядзенне новага жылога дома і гаспадарчых пабудоў, а таксама рэканструкцыя існуючага жылога дома і гаспадарчых пабудоў у раёнах сядзібнай забудовы, што ўжо склалася, дапускаецца на адлегласці менш за 3 і 1 м адпаведна ад мяжы зямельнага ўчастка пры наяўнасці натарыяльна заверанай пісьмовай згоды сумежнага(-ых) землекарыстальніка(-аў) і пры ўмове захавання супрацьпажарных, санітарных, экалагічных і іншых дзеючых нарматываў. Пры размяшчэнні жылога дома і (або) гаспадарчых пабудоў на адлегласці, менш за нарматыўную (для раёнаў, дзе ўжо склалася забудова), неабходна забяспечыць прылады арганізаванага водаадвядзення з даху, якія прадухіляюць сцёк дажджавой вады з дахаў на тэрыторыю суседняга (сумежнага) участка.

***Плошча і планіроўка*** гаспадарчага двара, аб'ём асабістай падсобнай гаспадаркі, склад гаспадарчых пабудоў залежаць ад плошчы прысядзібнага ўчастка і характару яго выкарыстання ў населеных пунктах розных тыпаў, працягвае адвакат Алена Гронская.

Склад і плошчы забудовы аб'ектаў прысядзібнага ўчастка (у залежнасці ад яго плошчы) прымаюць у адпаведнасці з табліцай.

У квадратных метрах

| Плошча прысядзібнага ўчастка | Склад і плошчы забудовы аб'ектаў прысядзібнага ўчастка | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Гаспадарчыя пабудовы | Сад | Агарод | Гаспадарчы двор, праезды, дарожкі |
| Да 600 | Да 100 | Ад 150 да 300 | Ад 30 да 150 | Ад 70 да 100 |
| Ад 600 да 1500 | Ад 100 да 200 | Ад 250 да 400 | Ад 150 да 400 | Ад 100 да 250 |

*Заўвага.* Для прысядзібных участкаў плошчай, большай за 1500 м², склад і плошчы аб'ектаў устанаўліваюцца праектам забудовы.

— Такім чынам, плошча гаспадарчых пабудоў залежыць ад памеру вашага ўчастка. Максімальная плошча на ўсе гаспадарчыя пабудовы ў сукупнасці пры плошчы ўчастка (падп. 6.3.10 СН 3.01.03-2020):

- да 6 сотак — да 100 кв. м;
- ад 6 сотак і больш — ад 100 да 200 кв. м.

— ***Вышыня*** гаспадарчай пабудовы, размешчанай на мінімальнай нарматыўнай адлегласці ад усталяванай мяжы, якая падзяляе сумежныя прысядзібныя ўчасткі, ад узроўню зямлі да звесу двухсхільнай або аднасхільнай кроквеннай канструкцыі, а таксама да верху парапета або някроквеннай канструкцыі (плоскага даху) з боку сумежнага ўчастка — не большая за 3 м, пры гэтым вышыня гаспадарчай пабудовы ад узроўню зямлі да канька павінна быць не большай за 5 м, — каментуе адвакат Алена Гронская. — Пры павелічэнні мінімальнай нарматыўнай адлегласці ад устаноўленай мяжы да пабудовы на кожны наступны метр вышыня пабудовы павялічваецца на 0,5 м.

Максімальная вышыня пабудовы ад узроўню зямлі пры яе прапарцыянальным ссоўванні ад устаноўленай мяжы не павінна перавышаць 7 м у каньку і адпаведна 5 м да верху парапета або някроквеннай канструкцыі (плоскага даху), каментуе адвакат.

Пры размяшчэнні гаспадарчых пабудоў на ўчастку варта ўлічваць магчымасць іх блакіравання ў розных спалучэннях паміж сабой. Адлегласць ад гаспадарчай пабудовы (гаража, лазні, цяпліцы), зблакіраванай з жылым домам, да мяжы суседняга (сумежнага) участка ўстанаўліваецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства.



## БУДУЕМ ПА ЗАКОНЕ

Перад будаўніцтвам гаспадарчай пабудовы, як правіла, трэба атрымаць дазвол у выканкаме, падкрэслівае адвакат Алена Гронская. Праектаванне, узвядзенне, рэканструкцыя, рэстаўрацыя, капітальны рамонт аб'екта (за выключэннем садовых домікаў, гаспадарчых будынкаў і збудаванняў, неабходных для вядзення калектыўнага садоўніцтва на зямельных участках, дадзеных членам садоўніцкага таварыства для гэтых мэт) ажыццяўляюцца на падставе дазвольнай дакументацыі, склад, парадак падрыхтоўкі і выдачы якой устанаўліваюцца з улікам патрабаванняў заканадаўчых актаў Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

— Гаспадарчую пабудову, узведзеную без атрымання дазволу, могуць абавязаць знесці за ваш кошт, а таксама накласці штраф за самавольнае будаўніцтва. Згодна з артыкулам 22.8 КаАП, самавольнае будаўніцтва аб'екта цягне накладанне штрафу ў памеры ад пяці да трыццаці базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — ад дваццаці да ста базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — ад дваццаці да пяцісот базавых велічынь.

Калі будаўніцтва гаспадарчай пабудовы не было прадугледжана ў праекце на будаўніцтва жылога дома, то для яе ўзвядзення спатрэбіцца атрымаць дазвольную дакументацыю.

— Для гэтага неабходна звярнуцца ў выканкам па месцы знаходжання дома з заявай. Узор і форма заявы, як правіла, знаходзіцца на інфармацыйным стэндзе адпаведнага выканкама. Дазвольная дакументацыя выдаецца бясплатна не пазней за адзін месяц пасля падачы заявы.

Гаспадарчая пабудова, як і любы іншы будынак, узводзіцца на падставе праектнай дакументацыі.

— Па распрацоўку праектнай дакументацыі неабходна звярнуцца ў праектную арганізацыю або да індывідуальнага прадпрымальніка, які ажыццяўляе такую дзейнасць. Гатовую праектную дакументацыю трэба ўзгадніць у аддзеле архітэктуры і горадабудаўніцтва выканкама. Для гэтага прадстаўце ў выканкам заяву і праектную дакументацыю.

Пасля атрымання дазволу і ўзгаднення праектнай дакументацыі прыходзіць час прыступаць да будаўніцтва гаспадарчай пабудовы. Будаваць можна сваімі сіламі або з прыцягненнем будаўнічай арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка). Пасля заканчэння будаўніцтва гаспадарчую пабудову трэба прыняць у эксплуатацыю.

Гаспадарчая пабудова не з'яўляецца самастойным аб'ектам нерухомасці, паколькі прызначана для абслугоўвання жылога дома. У сувязі з гэтым як асобны аб'ект яна не рэгіструецца. Але вам трэба атрымаць новы тэхпашпарт і пасведчанне на дом.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ЦЫМБАЛЫ, ВЕЛАТРЭНАЖОР І ЦУДА-ЛЯМПА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

І сапраўды, звярнула ўвагу: па Мінску ездзіць даволі шмат машын з надпісам «каршэрынг». Кошт у многім залежыць ад таго, якой маркі машыну вы арандуеце. Напрыклад, 20 хвілін за абаранкам Volkswagen Polo абыдзецца прыблізна ў 9 беларускіх рублёў. За тую ж самую 20-хвілінную паездку на Tesla Model X заплаціце 55 рублёў. У сувязі з павышэннем цэн на паліва і падаражаннем запчастак попыт на гэтую паслугу можа ўзрасці. Дарэчы, чым не арыгінальная ідэя для падарунка мужу — арандаваць на гадзіну электрамабіль?

## ЧАРГА НА «БІЯПТРОН»

У Беларусі працуюць некалькі дзясяткаў як дзяржаўных, так і прыватных пунктаў пракату. Там можна ўзяць у часовае карыстанне бытавую тэхніку, мэблю, спартыўныя тавары, будаўнічы інструмент, прадметы медыцынскага прызначэння, дзіцячыя тавары і нават музычныя інструменты.

**«Пасля зімы ўсе худнеюць, хочуць прывесці сябе ў форму. У прыватнасці, месяц арэнды бегавой дарожкі каштуе 26,35 рубля (па 85 капеек за суткі)».**



— З надыходам цеплыні найбольшым попытам карыстаюцца ровары, — кажа **загадчыца аднаго з пунктаў пракату УП «Белхімчыстка» Алена СІПАКОВА**. — Па іх перад выхаднымі часта прыходзяць цэлымі сем'ямі. Суткі арэнды горнага веласіпеда абыдуцца ў 17,5 рубля. Але на такі кароткі тэрмін бярэ мала хто. Бо ў залежнасці ад працягласці арэнды ў нас прадугледжаны прыемныя зніжкі. Ад 5 сутак — зніжка 50 працэнтаў — 8,52 рубля за суткі, ад 16 сутак — ужо 3,35 рубля. Чым на большы тэрмін бярэш, тым выгадней. Каб узяць рэч напракат, патрэбны толькі пашпарт. На месцы афармляецца дагавор арэнды.

Улетку як гарачыя піражкі разлятаюцца таксама ролікі, турыстычныя палаткі, спальныя мяшкі.

— Іх бярэ не толькі моладзь для адпачынку на прыродзе, але і прадпрыемствы, — працягвае Алена Леанідаўна. — Да пандэміі работнікі завода «Інтэграл», што насупраць нашага пункта пракату, пастаянна выязджалі на турзлёты.

Што цікава, зімні асартымент тут нават улетку не прымаюць з вітрыны. Каб людзі, якія прыходзяць па веласіпеды, ведалі, што ўзімку іх тут ужо чакаюць цюбінгі, лыжы, фігурныя канькі, снаўборды. Гарналыжныя камплекты ў дзяржаўным пункце пракату каштуюць крыху танней, чым у тых жа Сілічах, Раўбічах. Да таго ж не трэба губляць час у чарзе. Таксама, калі стаіць галалёдзіца і людзі падаюць і ламаюць ногі — бяруць напракат мыліцы. Пакарыстаўся месяц-другі — заплаціў 25—50 рублёў — і вярнуў. Новыя мыліцы каштуюць рублёў 90. Але не ва ўсіх ёсць месца, дзе іх пасля захоўваць. Ды і навошта?

дабалася, ужо набываюць. Калі на нейкі тавар павышаны попыт, людзі пастаянна пытаюцца, мы дакупляем яго. У прыватнасці, вельмі запатрабаваная лямпа «Біяптрон». Бяруць, каб вушкі дзеткам лячыць і носікі. І ад пролежняў гэтая цуд-лямпа, як я яе называю, дапамагае. Урачы часта рэкамендуюць лячэнне святлом сваім пацыентам. Таму ў нас у восеньска-зімова-вясновы перыяд заўсёды на лямпу чарга.



— Сяброўка распавядала, што пасля таго, як яе бацькі перахварэлі на каранавірус, узяла ім для рэабілітацыі напракат трэнажор.

— Сапраўды, падчас пандэміі шмат бралі трэнажораў для рэабілітацыі. Пры праблемах з дыханнем, як правіла, прызначаюць ЛФК. Хадзіць некуды на заняткі пажылыя баяліся, таму дзеці прыходзілі і арандавалі для іх трэнажоры. Яны і цяпер карыстаюцца попытам. Пасля зімы ўсе худнеюць, хочуць прывесці сябе ў форму. У прыватнасці, месяц арэнды бегавой дарожкі каштуе 26,35 рубля (па 85 капеек за суткі). Гэта вельмі выгадна, бо купіць новую не кожны сабе можа дазволіць.

Часта людзі купляюць велатрэнажор на эмоцыях. Месяц-два пакруцілі педалі — надакучыла. І той даражэзны грувасткі агрэгат стаіць і пыліцца без справы, толькі месца займае. Таму некаторыя не спяшаюцца з пакупкай, бяруць на месяц у арэнду, каб паспрабаваць. А потым, калі спа-

## ПАЛАЧКА-ВЫРУЧАЛАЧКА ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

Пункты пракату — палачка-выручалачка для іншагародніх студэнтаў. Часцей за ўсё яны арандуюць халадзільнікі на вучэбны год.

— Мы можам самі даставіць халадзільнік у інтэрнат ці кватэру, якую яны здымаюць, — распавядае Алена Сіпакова. — Гэта выгадна, бо арэнду аплочваюць некалькі чалавек ускладчыну. Плаціць, што вельмі зручна, можна не адразу за ўвесь тэрмін, а па месяцах. У месяц арэнда халадзільніка «Атлант» каштуе 33 рублі. За два гады, вядома, можна набыць і новы. Але студэнтам, напрыклад, ён проста не патрэбны. Яны ж адвучыліся і раз'ехаліся. Акрамя таго, халадзільнікі і іншую бытавую тэхніку бяруць напракат на здымныя кватэры і на час рамонту, у тым выпадку, калі штосьці зламалася. На летні сезон



халадзільнікі карыстаюцца папулярнасцю ў дачнікаў.

***— А што рабіць, калі штосьці зламалася ў халадзільніку, які ўзялі напракат?***

— Гледзячы па чыёй віне ламаецца. Калі па віне кліента, то ён і кампенсуе ўрон. Калі не, то самі рамантуем за свой кошт. Але такое здараецца нячаста, бо мы пастаянна абнаўляем асартымент тавараў. Калі ж халадзільнік ламаецца па віне вытворцы, то мы па гарантыі здаём яго на завод. Кліенту ў гэты ж дзень прывозяць замену.

Таксама нярэдка бяруць напракат будаўнічыя і садовыя інструменты — дрылі, шрубакруты, перфаратары. Трэба падрэзаць жывую агароджу — можна ўзяць кустарэз, задумалі ўстанавіць плот — бетонамяшалку. Летась, каб сэканоміць, мой муж сам вырашыў пакласці плітку дома ў сваіх і маіх бацькоў. Для гэтага яму спатрэбіўся пліткарэз. Набываць яго не бачылі сэнсу, бо больш наўрад ці ў найбліжэйшы час прыйдзецца класці плітку. Сябар, у якога гэты агрэгат пасля рамонту якраз ляжаў без справы, даў ім пакарыстацца. Калі б не гэта, то, відавочна, і мы звярталіся б у пункт пракату.

## ДЗЕТКІ-КВЕТКІ РАСТУЦЬ ХУТКА

Часта бацькі бяруць дзецям напракат музычныя інструменты.

— У нас ёсць піяніна «Беларусь», акардэоны, баяны, скрыпкі. Але самай вялікай папулярнасцю карыстаюцца цымбалы. Гэты інструмент дарагі. Не ўсе могуць дазволіць яго сабе купіць. Ды і нярэдкая гісторыя, што дзіця вельмі хутка мяняе свае жаданні. Сёння трызніць цымбаламі, а заўтра, пакантактаваўшы з сяброўкай, якая ходзіць на каратэ, просіць набыць кімано.

Па маіх назіраннях, на прасторах інтэрнэту больш за ўсё пунктаў пракату менавіта дзіцячых тавараў. І нядзіўна. Дзеткі-кветкі вельмі хутка растуць. Задайце сабе пытанне: колькі малы будзе гуляць у манежы ці радавацца электронным арэлям-гушкалцы? Ну, паўгода, максімум год. Затым гэтыя рэчы будуць проста займаць месца на паліцах. Набываць тую ж радыёняню ці вагі для ўзважвання немаўля, каб потым стаялі, — навошта? Узяў на паўгода і вярнуў. Можна, вядома, набыць, а потым, калі пашчасціць, прадаць на тым жа «Куфары». Але майце на ўвазе, што нават рэч у ідэальным стане там выстаўляюць не больш як за паўцаны.

— У нас не надта багаты асартымент дзіцячых тавараў: манежыкі, хадункі, крэселкі для кармлення, — кажа Алена Леанідаўна. — Таму маладыя бацькі ў нас не асноўныя кліенты, хутчэй за ўсё, звяртаюцца ў спецыялізаваныя пункты пракату — туды, дзе большы выбар.

— Цудоўна, што ёсць магчымасць узяць дзіцячыя дэвайсы напракат, — лічыць Кацярына з Мінска, мама дваіх хлопчыкаў. — Усё, што датычыцца дзяцей, каштуе ў крамах вельмі дорага, не кожнаму гэта па кішэні. Пракат жа можа сабе дазволіць кожны. Прычым, узяўшы цацку на нейкі час я не толькі эканомлю, але і раблю больш разнастайнымі забавы для сваіх дзетак. У прыватнасці, я наўрад ці набыла б сваім дзецям развіццёвы бізікуб. Мяне спыняла цана — больш як 150 рублёў. А таксама тое, што раптам малыя пагуляюць дзень-два, і ім гэтая цацка будзе нецікавая. Але дзякуючы службе пракату бізікуб з'явіўся ў нашай кватэры. Дзеці развіваліся цэлы месяц усяго за 20 рублёў. Плюс мяне грэе думка, што, беручы рэчы напракат, я клапачуся аб прыродных рэсурсах. А свядомае спажыванне зараз, як ніколі, у трэндзе.

## ВЯСЕЛЬНАЯ СУКЕНКА — НОВАЯ ЦІ Ў АРЭНДУ?

З надыходам цеплыні пачынаецца вясельны сезон. Таму ўжо зараз на форумах ідуць гарачыя дыскусіі: браць сукенку напракат альбо набываць новую. Тут меркаванні разыходзяцца. Адны не бачаць сэнсу купляць сукенку, якую надзенуць усяго адзін раз. «Вельмі сучасна ўзяць напракат. Бо пасля не баліць галава, дзе захоўваць і як прадаць». «Навошта траціць грошы на новую сукенку, якая будзе вісець і жаўцець у шафе. Лепш я сэканомленыя грошы (вясельная сукенка напракат абыдзецца ў два разы, а то і яшчэ танней, чым такая ж куплёная) пушчу на мядовы месяц ці штосьці з мэблі ў кватэру куплю». Іншыя ж сцвярджаюць, што выходзіць замуж у чужой сукенцы — дрэнная прыкмета. «Калі сын жаніўся, новая сукенка для нявесткі была маёй асноўнай умовай. Бо ўсе знаёмыя, якія пазычалі ў сяброўак, доўга ў шлюбе не жылі. Няхай на рэстаранах і картэжах сэканомяць, але толькі не на сукенцы». Кожны сам вырашае, у што верыць, а таксама на што мэтазгодна траціць свае грошы. Скажу толькі адно: у мяне дзве знаёмыя зараз падалі заявы на развод. Адна брала сукенку напракат, а другая выходзіла замуж у новай. Што-што, а трываласць шлюбу менш за ўсё залежыць ад рэчаў, якія хтосьці да гэтага надзяваў.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# У ЭПІЦЭНТРЫ ЎВАГІ — СТАНДАРТЫ ЯКАСЦІ І БЯСПЕКА ЛЕКАЎ

ОАО «НЕСВИЖСКИЙ ЗАВОД МЕДИЦИНСКИХ ПРЕПАРАТОВ»



Дырэктар ААТ «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў» Генадзь ЖЫВЕНЬ.

**Адзін з лідараў фармацэўтычнага рынку Беларусі, Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў, падчас пандэміі быў у ліку тых прадпрыемстваў, якое забяспечвала ўстановы аховы здароўя, у прыватнасці, рэанімацыйныя аддзяленні, неабходнымі прэпаратамі. Працаваць у такія няпростыя часы даводзілася на мяжы магчымасцяў, аднак пастаўленыя задачы былі выкананы. Сёння прадпрыемства ўвайшло ў звыклы рэжым работы і выкарыстоўвае гэты час для мадэрнізацыі вытворчасці.**

## АДЗНАЧАНЫЯ Ў ГАНАРОВАЙ НАМІНАЦЫІ



**Генадзь СВЯТЛОВІЧ, першы намеснік дырэктара – галоўны інжынер,** узнагароджаны Ганаровай граматай Мінскага аблвыканкама.

Працуе на прадпрыемстве з 1994 года. Пачынаў з рабочай спецыяльнасці — слесарам па кантрольна-вымяральных прыборах і аўтаматыцы. Таксама працаваў майстрам, а затым начальнікам участка электразабеспячэння, намеснікам, а пасля галоўным энергетыкам. З 2014 года — галоўны інжынер прадпрыемства. Менавіта пад яго кіраўніцтвам рэалізоўваліся маштабныя праекты па мадэрнізацыі вытворчасці, апошні з якіх — устаноўка аўтаматызаванай лініі вытворчасці інфузійных раствораў у поліэтыленавых пакетах.



**Іна САРОКА, мікрабіёлаг,** атрымала падзяку міністра аховы здароўя.

Працуе на прадпрыемстве з 1984 года — ужо 38 гадоў. Прыйшла адразу пасля заканчэння Маладзечанскага політэхнічнага тэхнікума і працавала на розных пасадах: апаратчыкам, лабарантам хімічнага аналізу, кантралёрам медыцынскай прадукцыі, лабарантам-мікрабіёлагам, тэхнікам-лабарантам.

Адказвае за мікрабіялагічны кантроль вытворчага асяроддзя. Гэта значыць, за чысціню вытворчых ліній і паветра ў вытворчых памяшканнях, а таксама бяспеку лекаў на стадыі вытворчасці і ўваходны катроль сыравіны, матэрыялаў, пярвічнай упакоўкі, вады.



**Галіна ЧУРАК, кладаўшчык,** атрымала падзяку міністра аховы здароўя.

Працуе на прадпрыемстве 33 гады. У яе службовых абавязках — прыёмка гатовай прадукцыі і адгрузка, таксама жанчына адказвае за яе захаванасць. Упэўненая, што працяглай рабоце на прадпрыемстве садзейнічаюць і калектыў, і камфортныя ўмовы працы, і годная зарплата. Дарэчы, з прадпрыемствам звязана амаль уся сям'я Галіны Васільеўны: больш за тры дзесяцігоддзі аддаў заводу яе муж, тут жа працуюць дачка і зяць.



Хімік Валянціна ГРЫЦКЕВІЧ занятая колькасным вызначэннем дзеючага рэчыва.

## Падчас пандэміі — з поўнай аддачай

Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў забяспечвае ўнутраны фармацэўтычны рынак інфузійнымі растворамі. Яны адыгрываюць надзвычай важную ролю ў сучаснай медыцыне — прымяняюцца ў рэанімацыі, хірургіі, акушэрстве, гінекалогіі, тэрапіі, пры лячэнні інфекцыйных хвароб. Інфузійныя растворы адносяцца да ліку прэпаратаў, якія найбольш часта прызначаюцца пацыентам.

Натуральна, падчас пандэміі COVID-19 попыт на іх істотна павялічыўся.

— Працавалі напружана, з аддачай усіх сіл. Прыйшлося задзейнічаць дадатковыя рэзервы. Абслугоўваць усе нашы лініі і абсталяванне для забеспячэння яго бесперапыннага функцыянавання даводзілася па-за планам, і машыны нас не падвялі, — згадвае два апошнія гады работы **дырэктар Нясвіжскага завода медыцынскіх прэпаратаў Генадзь ЖЫВЕНЬ.**

Устойлівую работу прадпрыемства лепш за ўсё адлюстроўваюць эканамічныя паказчыкі. Летась аб'ём прамысловай вытворчасці склаў 119,8 % у параўнанні з 2020 годам. Чысты прыбытак — 4 мільёны 447 тысяч. Гэта высокі паказчык, асабліва з улікам таго, што прадукцыя прадпрыемства сацыяльна значная, а значыць, цэны на яе рэгулююцца. Рэнтабельнасць продажаў складае 13 %. Заработная плата на прадпрыемстве па выніках года дасягнула 1450 рублёў, што перавышае сярэднюю па раёне. Нягледзячы на высокі рост прамысловай вытворчасці, удалося перавыканаць і такі паказчык як энергазберажэнне: па выніках года ён склаў мінус 4,7 % пры заданні мінус 4,5 %.

## Новая лінія — новыя магчымасці

На прадпрыемстве скончана ўсталёўка новай лініі, якая забяспечвае поўны цыкл вытворчасці інфузійных раствораў у поліэтыленавых пакетах. Калі раней гатовыя пакеты даводзілася закупляць у замежных пастаўшчыкоў, то новае абсталяванне дазваляе вырабляць уласныя. Аўтаматызаваная лінія аднаго з сусветных вытворцаў фармабсталявання працуе цалкам па замкнёным цыкле: з палімернай плёнкі фарміруецца пакет, напаўняецца прэпаратам, упакоўваецца і ў гатовым выглядзе сыходзіць з лініі, расказвае **першы намеснік дырэктара – галоўны інжынер прадпрыемства Генадзь СВЯТЛОВІЧ.** Абсталяванне практычна выключае ўдзел чалавека ў вытворчым працэсе, для яго абслугоўвання дастаткова аднаго аператара. Прадукцыйнасць лініі складае каля 1500 упаковак за гадзіну, а гэта каля васьмі мільёнаў упаковак за год.

Устаноўка лініі стала завяршальным этапам мадэрнізацыі вытворчасці інфузійных раствораў у палімерных кантэйнерах. Тут былі праведзены будаўнічыя і рамонтныя работы, абсталяваны вытворчыя памяшканні, зманціравана сістэма вентыляцыі і кандыцыянавання.

Астатнія вытворчыя цэхі былі абноўлены на працягу апошніх гадоў.

У 2016 годзе рэалізоўваўся буйны праект па мадэрнізацыі ўчастка вытворчасці інфузійных раствораў у шкляной тары. Была закуплена новая лінія, якая таксама працуе па замкнёным цыкле: ад мыйкі да ўпакоўкі.



Уваходны кантроль поліэтылену дручаны лабаранту хіманалізу Веранiцы ХАМЯКОВАЙ.

Адным з кірункаў мадэрнізацыі Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў абраў удасканаленне якасці лабараторных даследаванняў. Два гады таму была пабудавана новая мікрабіялагічная лабараторыя, якая цяпер цалкам адпавядае ўсім стандартам. У кожным з «чыстых» блокаў праводзіцца асобны від выпрабаванняў на мікрабіялагічную чысціню і стэрыльнасць, што ў фармацэўтычнай вытворчасці надзвычай важна, адзначае **начальнік мікрабіялагічнай лабараторыі Таццяна ШАРАМЕТА.**

Сёлета праведзена мадэрнізацыя хімічнай лабараторыі: у існуючым будынку правялі рамонтныя работы з закупкай новага абсталявання. Менавіта сюды для ўваходнага кантролю паступае сыравіна, якая прымяняецца для вырабу прэпаратаў. Таксама тут выконваецца кантроль прамежкавай прадукцыі. Калі яна прайшла ўсе стадыі вытворчасці, адбываецца адбор узораў і праводзіцца кантроль па ўсіх паказчыках гатовых лекавых сродкаў.



За абсталяваннем для высокаэфектыўнай вадкаснай храматаграфіі — хімікі Яўген АНДРОСІК і Ягор СТАШЭЎСКІ.

## У перспектыве — новая лабараторыя

У будучым плануецца будаўніцтва біялагічнай лабараторыі.

— Мы прынялі рашэнне пабудаваць для дзеючай біялагічнай лабараторыі новыя памяшканні на новым месцы з улікам самых сучасных патрабаванняў. Справа ў тым, што частку нашых прэпаратаў пасля выпуску мы выпрабоўваем на жывёлах, у прыватнасці, на трусах. Прэпарат пры ўвядзенні ў арганізм не павінен выклікаць пірагенную рэакцыю, у тым ліку пад'ём тэмпературы. У новай лабараторыі мы плануем адмовіцца ад жывёл і праводзіць так званыя LAL-тэсты на эндатаксіны. Месца для будаўніцтва ўжо вызначана, атрыманы дазволы, распрацавана канцэпцыя. Пакуль займаемся праектам, да канца года плануем пачаць будаўніцтва, а ў 2023-м, мяркую, здадзім новую біялагічную лабараторыю ў эксплуатацыю, — дзеліцца планамі Генадзь Жывень.

Запланавана на сёлета і мадэрнізацыя ўчастка водападрыхтоўкі і аддзялення падрыхтоўкі. У хуткім часе пачнецца работа над праектам, вядзецца абследаванне канструкцый і распрацоўваецца канцэпцыя.

— Згодна з законамі вытворчасці ў фармацэўтыцы, адна ёмістасць — адна серыя. Гэта значыць, што прэпарат разліваецца з пэўнай ёмістасці, і яму прысвойваецца пэўны серыйны нумар. Пасля гэтага ў абавязковым парадку неабходна правесці міжсерыйную апрацоўку і ёмістасці, і лініі разліву, нават калі далей мы збіраемся разліваць той жа прэпарат. Гэта затраты і сродкаў, і часу. Акрамя таго, кожную серыю мы мусім падвергнуць выпрабаванням. Таму плануем на асноўныя прэпараты паставіць ёмістасці большага аб'ёму, каб зменшыць колькасць серый і, адпаведна, колькасць міжсерыйных апрацовак. Гэта дазволіць падоўжыць цыкл разліву, знізіць затраты пры вытворчасці, павялічыць прадукцыйнасць абсталявання, — тлумачыць кіраўнік прадпрыемства.

## Пазбавіцца залежнасці ад імпарту

Фармацэўтычная галіна амаль у кожнай краіне залежыць ад імпарту. Найперш у сыравіне, бо вытворчасць фармацэўтычных субстанцый — справа вельмі нятанная. З улікам таго, што пэўныя складнікі патрабуюцца ў невялікай колькасці, імпартаваць іх — сусветна прынятая практыка.

Тое ж датычыцца і пярвічнай упакоўкі, а гэта шкляныя і поліэтыленавыя бутэлькі, пакеты з медыцынскага поліэтылену, еўракаўпачкі. Прадпрыемства атрымлівала іх у сусветных вытворцаў. Аднак яшчэ некалькі гадоў таму пачало работу па імпартазамяшчэнні.

— Мы даўно пачалі працаваць над заменай пярвічнай упакоўкі на айчынную. Гэта няпростая задача, бо не кожнае прадпрыемства здолее выпускаць той жа поліэтылен для медыцынскіх мэт, гэта асобная вытворчасць. Аднак па поліэтыленавых пакетах мы паспяхова вялі работу з адным з нашых прадпрыемстваў. У выніку яны выканалі неабходныя нам патрабаванні, мы паставілі гэтую ўпакоўку на выпрабаванні, завяршаецца рэгістрацыя, і з мая мяркуюцца першыя пастаўкі. Раней яны зрабілі для нас еўракаўпачак, — расказвае Генадзь Жывень.

Асаблівасці фармацэўтычнай вытворчасці ў тым, што новая ўпакоўка, нават нягледзячы на тое, што яна ідэнтычная па матэрыяле і характарыстыках, усё роўна мусіць прайсці выпрабаванні, у прыватнасці, даследаванне ўплыву ўпакоўкі на стабільнасць лекавага сродку, якое доўжыцца не менш за паўгода. Пасля гэтага праходзіць працэдура рэгістрацыі. Паскораная займае два месяцы, у звычайным рэжыме — да 180 дзён. Таму з улікам гэтых працэдур замена пярвічнай упакоўкі займае каля года.

— Цяпер Міністэрства аховы здароўя прымае меры па паскарэнні гэтых працэсаў. Але мы планамерна і раней працавалі над заменай імпартнай упакоўкі. Вядома, з увядзеннем санкцый у нас узніклі пэўныя праблемы, у тым ліку ў лагістыцы, яны датычацца дастаўкі субстанцый. Але мы пераводзім іх у ранг задач, якія імкнёмся выканаць, — рэзюмуе дырэктар прадпрыемства.

## Абараніць работніка ў любых абставінах

«Усе дасягненні прадпрыемства — заслуга яго калектыву», — менавіта такая пазіцыя кіраўніцтва. На заводзе працуюць 461 чалавек. Стварыць для іх камфортныя ўмовы — адна з ключавых задач. Калектыўны дагавор, які дзейнічае на прадпрыемстве, прадугледжае шэраг умоў, што прызначаны абараніць работніка ў розных жыццёвых абставінах. Матэрыяльная дапамога (а ў некаторых выпадках і беспрацэнтная пазыка) выплачваецца пры ўступленні ў шлюб, нараджэнні дзіцяці, смерці блізкага чалавека, на аздараўленне, да дзяржаўных свят, пры цяжкім матэрыяльным становішчы. Дапамогу атрымалі супрацоўнікі, якія перанеслі COVID-19, прэміраваны былі работнікі прадпрыемства, якія зрабілі прышчэпку ад каранавіруса.

На кожную працоўную змену супрацоўнікаў дастаўляе транспарт прадпрыемства. За кошт прафсаюзнай арганізацыі аплачваюцца абанементы для работнікаў у басейн ды трэнажорную залу. Сёлета на прадпрыемстве адрадзілі валейбольную каманду, якая ўзяла ўдзел у раённых спаборніцтвах і заняла другое месца. Між іншым, удзельнікі спаборніцтваў, самадзейнасці, члены добраахвотнай народнай дружыны таксама заахвочваюцца ўстаноўленымі прэміямі.

Апошнім часам завод не адчувае дэфіцыту спецыялістаў. Выпускнікі, якія выбіраюць Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў месцам свайго размеркавання, нярэдка застаюцца тут працаваць і далей. Прадпрыемства з'яўляецца базай для праходжання практыкі дзвюх медыцынскіх ВНУ, а таксама Белдзяржуніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Кожнаму маладому спецыялісту прадастаўляецца інтэрнат — а дакладней, адрамантаваны пакой з мэбляй. Прыедуць маладыя спецыялісты на завод і сёлета. Можна не сумнявацца, што першае рабочае месца ўмацуе іх упэўненасць у правільнасці выбару спецыяльнасці, а новы калектыў усебакова падтрымае.





Эканаміст па збыце Святлана ШЫЦЬКО.



Хімік Наталля РАДКЕВІЧ занятая вызначэннем колькасці вады ў субстанцыі.

**Матэрыял падрыхтавалі Алена КРАВЕЦ, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 600031159


**Узденский районный исполнительный комитет 30 мая 2022 года в 10.00 по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22 проводит открытый аукцион за право частной собственности на земельные участки и на права заключения договоров аренды земельного участка**

Организатор аукциона – Узденский районный исполнительный комитет

На аукционные торги по продаже земельных участков в частную собственность гражданам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов выставляются участки:

| № лота | Местонахождение участка | Площадь S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма возмещения затрат на оформление и регистрацию участка, (кроме расх. на публ-цию извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская обл., г. Узда, ул. Василия Ерёменко, уч. № 22 | 0,1199 | 625650100003001740 | 24100,00 | 2410,00 | 1442,64 | Земельный участок расположен на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне пруда № 87) на площади 0,1199 га |
| 2 | Минская обл., г. Узда, ул. Василия Ерёменко, уч. № 24 | 0,1200 | 625650100003001742 | 24100,00 | 2410,00 | 1442,64 | Земельный участок расположен на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне пруда № 87) на площади 0,1200 га |

На аукционные торги на право заключения договора аренды выставляются земельные участки:

| № лота | Местонахождение участка | Площадь S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма возмещения затрат на оформление и регистрацию участка, (кроме расх. на публ-цию извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3 | Минская обл., г. Узда, ул. Партизанская | 0,0094 | 625650100003001863 Для установки и обслуживания торгового павильона модульного типа | 110,78 | 11,08 | 1559,02 | Земельный участок расположен на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне пруда № 26) на площади 0,0094 га |
| 4 | Минская обл., Узденский район, в районе г. Узда | 0,2041 | 625650100002000296 Для строительства и обслуживания автостоянки с подъездом в районе г. Узды Минской области (объект № 17) | 227.06 | 22,71 | 2062,11 | Земельный участок расположен в охранных зонах электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт на площади 0,0055 га, в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0016 га, в санитрано-защитной зоне организаций, сооружений и иных объектов на площади 0,0704 га |
| 5 | Минская обл, Узденский район, Хотлянский с/с, аг. Хотляны, ул. 4-я | 0,0444 | 625681718601000323 | 110,77 | 11,08 | 2111,50 | |

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (либо через своего представителя или уполномоченное лицо) предъявляет:

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

Кроме того, в комиссию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ, с указанием банковских реквизитов юридического лица (для уточнения правильности оформления необходимого пакета документов обращаться по телефону 8 (01718) 63960).

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

После получения необходимых документов от гражданина, индивидуального предпринимателя и юридического лица на участие в аукционе комиссия или организация выдает ему билет участника аукциона, который перед началом аукциона необходимо обменять на аукционный номер.

**Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 405, по рабочим дням с 27 апреля по 24 мая 2022 г. включительно с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30.**

Аукцион состоится по лоту при наличии двух или более участников аукциона.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY18AKBB36006310025120000000 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области, г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код банка AKBBBY2X, код платежа – 4901 (плата за право частной собственности на земельные участки), платежным поручением (квитанцией) с пометкой «Задаток за земельный участок».

Заключительная регистрация – с 9.00 до 9.50 в день проведения аукциона.

Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) производится в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков, предварительно позвонив по телефонам 8(01718)65404, 63960.

**Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.gov.by, либо по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, каб. 405 и по телефону (801718) 63960.**



**ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БЕЛАРУСЬРЕЗИНОТЕХНИКА»**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY.

Продавец: **ОАО «Беларусьрезинотехника»** (УНП 700069297) 213829, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, в лице управляющего Шпакова Олега Петровича.

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019/6 в экономическом суде Могилевской области будут проведены: **30 мая 2022 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС 20 % | Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Теплообменник 500 ТП-16М, инв. № 27619, б/у | 8760,00 | 6132,00 |
| 2 | Теплообменник 500 ТП-16М, инв. № 27620, б/у | 8760,00 | 6132,00 |
| 3 | Автомобиль грузопассажирский специальный вагон, УАЗ 39629-016, 2006 г. в., серый, кузов (рама) № 39620060215368, рег. знак 6ЕВТ9513 | 3000,00 | 2100,00 |
| 4 | Автомобиль грузовой фургон (furgon), GAZ-33022, 1996 г. в., серый, кузов (рама) № 0000773 XTH330210T1588118, рег. знак AI 4948-6 | 3480,00 | 2436,00 |

**Местонахождение предметов торгов – Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, тел. для ознакомления +375 29 698-53-53**

Для участия в торгах необходимо в срок с 29.04.2022 г. 09.00 по 27.05.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация». Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Победитель торгов обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 10 календарных дней со дня завершения электронных торгов. Победитель торгов (претендент на покупку), обязан оплатить предмет торгов в соответствии с условиями договора купли-продажи, но не позднее 30 календарных дней, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** | | |
| **Продавец** | **Торговое унитарное предприятие «Белкоопвнешторг Белкоопсоюза», г. Минск, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, 62, каб. 215** | | |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** | | |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** | | |
| **Предмет электронного аукциона** | | | |
| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инвен. № |
| **Лот № 1** Адрес: **Витебская обл., Браславский р-н, г. Браслав, ул. Ленинская, 133** | | | |
| **Здание кафе** | здание специализированное для общественного питания | 570,5 кв. м | 210/С-11424 |
| Составные части и принадлежности: подвал, терраса, покрытие три участка, ограждение два участка, парапет, лестницы | | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,1486** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 07.02.2034) для обслуживания кафе | | | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 592 872,00 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 2** Адрес: **Витебская обл., Браславский р-н, Слободковский с/с, аг. Слободка, ул. Ленинская, 35А** | | | |
| **Здание магазина** | здание специализированное розничной торговли | 803,8 кв. м | 255/С-15441 |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,1774** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 19.03.2035) для обслуживания здания магазина. Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона реки, водоема (оз.Потех); природная территория, подлежащая спец. охране (охранные зоны особо охраняемых природных территорий) (Национальный парк «Браславские озера»); охранные зоны электрических сетей до 1000В (пл. 0,0012 га и 0,0039 га) | | | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 309 267,74 бел. руб.** | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения электронных торгов | | | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи | | | |
| **Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах** | | | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену | | | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **1,5 % для лота № 1 и 2,5 % для лота № 2** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов | | | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения торгов | | | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов 31.05.2022 в 12.00. Окончание торгов 31.05.2022 в 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | | |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 30.05.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** | | |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «1-я Минская птицефабрика» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

- **склад-холодильник** *(составные части и принадлежности: 3 (три) навеса)*, **инв. № 601/С-31936 общей площадью 145,8 кв. м;**
- **убойный цех** *(составные части и принадлежности: 2 (два) навеса)*, **инв. № 601/С-31941, общей площадью 1000,4 кв. м, с технологическим оборудованием «Szlachet-Stal»;**
- **столярный цех, инв. № 601/С-31938, общей площадью 460,1 кв. м;**
- **склад канцкормов** *(составные части и принадлежности: операторская, навес с автовесами)*, **инв. № 601/С-31943, общей площадью 402,2 кв. м;**
- **склад ГСМ, инв. № 601/С-31937, общей площадью 64,5 кв. м;**
- **свинарник, инв. № 601/С-31935, общей площадью 296,4 кв. м;**
- **сарай-гараж с/х** *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 601/С-31929, общей площадью 553 кв. м;**
- **пункт техобслуживания, инв. № 601/С-31932, общей площадью 719,9 кв. м;**
- **птичник №14, инв. № 601/С-31925,общей площадью 1329,2 кв. м;**
- **проходная, инв. № 601/С-31942, общей площадью 49 кв. м;**
- **мойка для машин, инв. № 601/С-31928, общей площадью 6,6 кв. м;**
- **мехмастерская** *(составные части и принадлежности: пристройка, беседка)*, **инв. № 601/С-31927, общей площадью 565,7 кв. м;**
- **котельная** *(составные части и принадлежности: насосная, дымовая труба)*, **инв. № 601/С-31939,общей площадью 892,9 кв. м;**
- **гараж на 25 автомашин, инв. № 601/С-31926, общей площадью 506,9 кв. м;**
- **ветсанпропускник убойного цеха** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-31940, общей площадью 578,2 кв. м;**
- **административное здание** *(составные части и принадлежности: подвал, 2 (две) пристройки, котельная)*, **инв. № 601/С-31931, общей площадью 1072,1 кв. м;**
- **весовая** *(составные части и принадлежности: навес с автовесами)*, **инв. № 601/С-31934, общей площадью 15,2 кв. м;**
- **птичник № 1** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22689,общей площадью 1749,7 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» Evrovent-500 для клеточного содержания кур-несушек;**
- **птичник № 2** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22690, общей площадью 2003,8 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» для выращивания бройлеров напольного содержания;**
- **птичник № 3** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. №601/С-22691,общая площадь – 1752,7 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» Evrovent-500 для клеточного содержания кур-несушек;**
- **птичник № 4** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22692, общей площадью 1789,8 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» для выращивания бройлеров напольного содержания;**
- **птичник № 5** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22693,общей площадью 1753,2 кв. м, с оборудованием «Техна» для клеточного содержания кур-несушек;**
- **птичник № 6** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22694, общей площадью 1411,8 кв. м;**
- **птичник № 7** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки, уборная)*, **инв. № 601/С-22695, общей площадью 1424 кв. м;**
- **птичник № 8** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22696, общей площадью 1318 кв. м;**
- **птичник № 9** *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 601/С-22697, общей площадью 1270,1 кв. м;**
- **птичник № 10** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22700, общей площадью 1910,4 кв. м;**
- **птичник № 11** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22698, общей площадью 1311,6 кв. м;**
- **птичник № 15** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22699, общей площадью 1739,4 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» Evrovent-500 для клеточного содержания кур-несушек.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623200000033000024 площадью 54,2646 га *(право постоянного пользования)* по адресу: Минская область, Логойский район, Плещеницкий с/с, 4.** *Земельный участок имеет ограничения в использовании: прибрежная полоса р. Двиноса, пл. 1,0900 га; водоохранная зона р. Двиноса, пл. 38,5276 га; охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, пл. 3,6770 га.*

- **цех переработки мяса** *(составные части и принадлежности: подвал, вход в подвал, навес)*, **инв. № 601/С-28939, общей площадью 410,6 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 623200000033000063 площадью 0,1924 га *(право постоянного пользования)* по адресу: Минская область, Логойский район, Р-63, 67-й км. 1/2.** *Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона р. Двиноса, пл. 0,1924 га; охранная зона линий электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0050 га; охранная зона линий электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0430 га; охранная зона придорожной полосы (контролируемая зона) автомобильных дорог, пл. 0,0785 га.*

С полным перечнем оборудования можно ознакомиться у организатора аукциона.

Начальная цена с НДС (20 %) – **2 948 352,00** бел. руб.

*Начальная цена снижена на 20 %.*

Задаток 10 % от начальной цены **– 294 835,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», код 369, г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в размере 1 (одного) процента. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 16.11.2021, 23.02.2022.

Аукцион состоится **12.05.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.05.2022** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65 516-80-64, (8029) 102-21-17.
Тел. для осмотра: 8017 504-83-58, 029 116-45-00.**

УНН 600068728

ЗВЯЗДА 105 ГАДОЎ: АДРАСЫ ГАЗЕТЫ

# ВЁСКА КАМСАМОЛЕЦ. ПАХАВАННЕ МІХАІЛА БАРАШКАВА

## Супрацоўнікі салігорскай раённай газеты «Шахцёр» добраўпарадкавалі магілу рэдактара «Звязды»-партызанкі

**Міхаіл Барашкаў узначальваў рэдакцыю найстарэйшай рэспубліканскай газеты ў найбольш складаны для краіны час — у гады Вялікай Айчыннай вайны. Пасля трагічнага правалу рэдакцыйнай дзейнасці ў акупаваным Мінску, дзе выйшлі чатыры нумары газеты, пяты быў падрыхтаваны, але так і не ўбачыў свет, працягнуць выпуск выдання было вырашана ў партызанскай зоне — сярод любанскіх балот на легендарным востраве Зыслаў.**

Тут у канцы студзеня 1943 года аднавіўся выпуск не толькі газеты «Звязда», а і рэспубліканскай маладзёжнай газеты «Чырвоная змена», а таксама любанскай раённай газеты «Кліч Радзімы», дзейнасць якіх была спынена вайной. Рэдактарам усіх трох перыядычных выданняў быў прызначаны Міхаіл Парфёнавіч Барашкаў.

Ён не дачакаўся запаветных пераможных залпаў — памёр у лютым 1944 года ад тыфу. Пахавалі журналіста-партызана ў вёсцы Камсамолец, цяпер гэта Салігоршчына. Побач з магілай Барашкава — пахаванні двух невядомых партызан. Дзякуючы супрацоўнікам салігорскай раённай газеты «Шахцёр» дагледжаныя і яны.

— Колькі я працую ў рэдакцыі (а гэта ўжо 13 гадоў), столькі і нават больш традыцыя даглядаць гэтыя пахаванні ўжо існавала, — расказала **выконваючая абавязкі галоўнага рэдактара салігорскай раённай газеты «Шахцёр» Ганна МАІСЕЕНКА**. — Гэта заканамерна, што магілу рэдактара падпольнай газеты даглядаюць не сельскі Савет, не школьнікі, а калегі, прадаўжальнікі гэтай прафесіі — нялёгкай ва ўсе часы, а тым больш у гады акупацыі. Мы ганарымся тым, што нашы папярэднікі не склалі свае паўнамоцтвы, не схаваліся і не збеглі ў такі складаны час, а працягвалі выконваць сваю работу. Для нас гэта яркі прыклад, як можна любіць сваю прафесію, як трэба быць адданым сваёй справе.



Супрацоўнікі газеты падфарбавалі агароджу, літары на помніках, прыбралі ад пазалеташняга лісця і смецця магілы, усклалі кветкі. Пахаванне заўсёды ў добрым стане. Яно знаходзіцца наводшыбе вёскі, каля самага лесу, у атачэнні пяці высачэзных хвой, якія, быццам волаты-ахоўнікі, вартуюць воінскае пахаванне, дзе вечным сном спяць тыя, хто змагаўся з акупантамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, набліжаў Перамогу — цаной уласнага жыцця. Міхаіл Барашкаў — менш зброяй, больш словам.

Над выпускам трох газет працавала ўсяго некалькі чалавек: былы рэдактар любанскай раённай газеты Філіп Касцюкавец, карэспандэнт даваеннай «Советской Белоруссии» Георгій Шчарбатаў, супрацоўнікі капаткевіцкай раённай газеты Амяльян Шурпач, Аляксандр Сакевіч, Мікалай Курыка і Ніна Цылько. Міхаіл Барашкаў не толькі адказваў за калектыў, ён таксама рыхтаваў артыкулы для друку.

У партызанскай зоне калектыву «Звязды», «Чырвонай змены» і «Кліча Радзімы» часта даводзілася мяняць месца дыслакацыі — такія абставіны ваеннага часу. Аднак не толькі ў лесе, сярод непралазных балот, ствараліся падпольныя газеты. Работа над іх выпускам вялася і ў навакольных вёсках, жыхары якіх давалі свае хаты пад абсталяванне рэдакцыі. Першыя нумары падпольных выданняў у партызанскай зоне выйшлі ў вёсцы Шостая брыгада (цяпер Дварэц) Любанскага раёна, у хаце Марфы Мігун.

Калектыў рэдакцыі сучаснай «Звязды» не раз быў на гэтым месцы, у свой час (у маі 1975 года) галоўны рэдактар Аркадзь Тоўсцік адкрываў устаноўленую на хаце мемарыяльную шыльду, якая сведчыць, што «тут у студзені 1943 года аднавілі ў падполлі выхад газеты «Звязда» — орган ЦК і Мінскага абкама КП(б)Б і «Чырвоная змена» — орган ЦК і Мінскага абкама ЛКСМБ». Падчас урачыстасці яшчэ была жывая сама гаспадыня. Сёння ў хаты — новыя гаспадары, якія добра ведаюць, якая гістарычная падзея адбылася ў гэтых сценах узімку 1943-га.

Падчас акупацыі хата, вядома, была іншая. Гэтую Марфе Мігун пабудавалі пасля вайны — такім чынам дзяржава падзякавала жанчыне за тое, што, рызыкуючы сабой і сваімі дзецьмі, пусціла сюды партызанаў. Яна не адразу даведалася, што тыя рабілі тут выключна важную справу — выпускалі газеты, якія не менш за зброю былі небяспечныя для ворага.

Як успамінаў супрацоўнік партызанскіх выданняў Амяльян Шурпач, умовы работы і быту былі жорсткія. «Мы не мелі права нікуды, акрамя нашых кватэр, адлучацца, нікому нічога казаць пра свой занятак, — пісаў ён пасля вайны. — Нам, вядома, не падабалася ўсё гэта. Пасля шматлікіх паходаў, небяспечных аперацый апынуцца ледзь не пад арыштам — прыемнасці мала. Хутка мы пераканаліся, што суровыя ўмовы канспірацыі — не выдумка, а жорсткая неабходнасць». І сапраўды, немцы старанна шукалі падпольную рэдакцыю, нават прыцягвалі для гэтых мэт найлепшых берлінскіх разведчыкаў.

У канцы сакавіка 1943 года, калі немцы знаходзіліся непадалёк ад падпольнай рэдакцыі, газетчыкі сабралі друкарню і перайшлі праз балотны масіў за вёску Дзвесніца. Тут, на знакамітым востраве Зыслаў, дзе ў тым ліку знаходзіўся партызанскі аэрадром, які прымаў самалёты з Вялікай зямлі, выйшла



большасць нумароў «Звязды»-партызанкі, «Чырвонай змены» і любанскай «раёнкі». Друкаваліся партызанскія газеты і ў вёсцы Камсамолец, якая размяшчалася ў Старобінскім (цяпер Салігорскім) раёне. Пасля вайны назва вёскі не мянялася. Тут і быў пахаваны Міхаіл Барашкаў.

Жыццё гэтага адважнага і таленавітага чалавека абарвалася 22 лютага 1944 года. «Не стала нашага рэдактара, уважлівага і чулага дарадчыка, умелага выхаваўцеля, бясстрашнага камуніста, — такімі словамі адазваўся пра гэтую сумную падзею калега-«звяздовец» Амяльян Шурпач. — На высокім грудку пад трыма стройнымі хвоямі вырас магільны курганок — апошняя даніна жывых загінуламу».

Ён, а таксама іншыя ўдзельнікі партызанскага руху, у тым ліку тыя, хто ўдзельнічаў у выпуску падпольных газет, неаднойчы пасля вайны наведвалі магілу Барашкава. Не раз тут бывала і жонка рэдактара. Яе добра памятае жыхарка вёскі Доўгае Таццяна Хаміцэвіч, дзяцінства якой прайшло ў Камсамольцы. Жанчына расказала, што пасля вайны жонка Барашкава прыязджала ў вёску часта, даглядала пахаванне, а калі не магла прыехаць, тэлефанавала ў школу, і магілу прыбіралі вучні. За гэта ўдава Барашкава частавала іх цукеркамі.

У партызанскай зоне выйшла 105 нумароў «Звязды», 48 выпускаў «Чырвонай змены» ўбачылі свет у няпростых умовах. Гэта быў сапраўдны подзвіг, аналагаў якому больш няма ні ў айчыннай, ні ў сусветнай журналістыцы.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота дадзена рэдакцыяй газеты «Шахцёр».**

# Нямецкая фабрыка смерці пад Гомелем

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Устаноўлена, што смерць гэтых людзей наступіла ў выніку агнястрэльных раненняў. Расстраляна менавіта мірнае насельніцтва, бо ў людзей былі прадметы хатняга ўжытку: кубкі, кацялкі, лыжкі, зубныя шчоткі. Гэта значыць, людзей вырвалі з дому, яны разлічвалі на нейкую нядоўгую адсутнасць, а ў выніку іх вывозілі сюды і расстрэльвалі, — адзначае Віктар Марозаў. — На месцы раскопак таксама знойдзены фрагменты калючага дроту, нямецкія манеты, элементы зброі. І калі нехта мяркуе, што гэта магчымыя месцы пахавання рэпрэсаваных у 1937 годзе, то і тут мы развянчалі іх тэорыі. Падкрэсліваю, балістычная экспертыза паказала, што людзі былі расстраляныя з нямецкай зброі.



На мінулым тыдні пракуратура Гомельшчыны аднавіла даследаванне месца самага масавага знішчэння мірных грамадзян часоў вайны ў Чонкаўскім лесе. Астанкі не менш як 30 чалавек былі знойдзены толькі за тры дні з пачатку аднаўлення пошукавых работ.

— Астанкі знаходзяцца на рознай глыбіні — ад паверхні зямлі да чатырох метраў уніз. Мы адпрацоўваем кожны раскоп да мацерыковага пласта глебы. Калі бачым некрануты пласт зямлі, цалкам зачышчаем сценкі. Атрымліваецца дно, і тады ўжо раскоп лічыцца адпрацаваным, — тлумачыць журналістам методыку работы **камандзір пошукавага ўзвода 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны Беларусі Уладзіслаў БЕРДНІК.**

Цяпер у пошукавай рабоце па расстрэльных ямах Чонкаўскага лесу задзейнічаны 15 байцоў — у асноўным ваеннаслужачыя восеньскага прызыву, якія прайшлі ўсё неабходнае навучанне і падрыхтоўку. Адначасова з правядзеннем раскопак працягваецца пошук новых месцаў расстрэлу мірных жыхароў у гэтым лесе.

— Яшчэ ў канцы восені былі разведаны іншыя ямы, на суботніку нашы работнікі пракуратуры разам з леснікамі ачысцілі ад зарасніку меркаваныя месцы расстрэлаў, гэта таксама спрашчае работу пошукавікам, — патлумачыў галоўны пракурор вобласці.

Таксама яшчэ ўвосень, перад ад'ездам пошукавікаў і прыпыненнем на зімовы перыяд работ па раскопках, супрацоўнікі пракуратуры пры падтрымцы следчых правялі дадатковую рэкагнасцыроўку мясцовасці. Дзякуючы здымкам з дрона былі ўстаноўлены блокі расстрэльных ям.

— Ёсць усе падставы сцвярджаць, што на дадзенай тэрыторыі размяшчаўся нейкі з відаў канцэнтрацыйных лагераў, — падкрэслівае **намеснік пракурора Гомельскага раёна Аляксандр ШЫНКАРОЎ.** — Пра гэта сведчыць тое, што тэрыторыя была абнесена калючым дротам. Яго фрагменты і скруткі, якія захаваліся, знойдзены падчас раскопак. Тыя судова-медыцынскія экспертызы, якія былі праведзены, кажуць аб тым, што яшчэ жывых людзей у ямах закідвалі гранатамі. На гэта ўказвае вельмі хаатычнае размяшчэнне касцей. На некаторых чарапах ёсць пашкоджанні, характэрныя для траўматычнага ўздзеяння, напрыклад удараў прыкладам.

Паміж блокамі расстрэльных ям пошукавікамі ўстаноўлена і месца дыслакацыі нямецкай расстрэльнай каманды.

— Дакладна вызначаны тэрыторыі палатачнага лагера нямецкіх салдат. Там знойдзены прадметы іх ужытку, узбраенне, фрагменты нямецкай тэхнікі, — падкрэслівае Аляксандр Шынкароў.

Сярод знаходак на гэтым месцы — сталовыя прыборы з нямецкай маркіроўкай, сапёрная рыдлёўка, якая была на ўзбраенні толькі ў немцаў, фрагмент абавязковай нямецкай ваеннай амуніцыі, «таблетніца» для лазанціну-хлору, што пры развядзенні ў вадзе выкарыстоўваўся для абеззаражвання.

— Самыя розныя знаходкі палатачнага нямецкага лагера сведчаць аб тым, што расстрэльная фашысцкая каманда ўжо менавіта абжылася на гэтым месцы, — упэўнены намеснік пракурора Гомельскага раёна.

Як вядома, сёлета ў Чонкаўскім лесе пошукавікамі і супрацоўнікамі пракуратуры будзе даследавана больш за 30 месцаў масавых расстрэлаў мірных жыхароў у гады нямецка-фашысцкай акупацыі.

— Перад вайной у Гомелі налічвалася 140 тысяч жыхароў, а калі Чырвоная Армія вызваліла яго, то ледзь налічылі 20 тысяч гамяльчан. Зразумела — вайна, фронт. Але ж куды маглі падзецца 100 тысяч чалавек? Упэўнены, усе гэтыя амаль 80 гадоў краязнаўцы, гісторыкі задаваліся такім пытаннем. Бо былі масавыя расстрэлы яўрэйскага насельніцтва ў верасні 1941 года, масавыя расстрэлы гамяльчан перад уваходжаннем савецкіх войскаў у Гомель, калі мужчын цэлымі прадпрыемствамі вывозілі за горад і забівалі, каб яны не папоўнілі шэрагі Чырвонай Арміі, — нагадаў пракурор вобласці Віктар Марозаў.

Кіраўнік ведамства ў рэгіёне адзначыў, што пасля выяўлення факта масавых расстрэлаў у Чонкаўскім лесе была створана абласная камісія па ўвекавечанні памяці загінулых. Па яе рашэнні, недалёка ад месца генацыду, па дарозе на мемарыяльны комплекс «Партызанская крынічка», будзе ўстаноўлены камень з памятнай дошкай. Тут жа адкрыюць капліцу. І дастойна пахаваюць астанкі людзей, знойдзеныя падчас раскопак.

— Людзі заслугоўваюць таго, каб памяць аб іх была захаваная, — падкрэсліў Віктар Марозаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Гомельскай абласной пракуратуры.**

# ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ ЎЛАСНАСЦЬ І ІНАВАЦЫЙНАЕ РАЗВІЦЦЁ

**У найбліжэйшы час кожны беларускі ўніверсітэт распрацуе сваю стратэгію развіцця навукі. Адзін з яе раздзелаў будзе прысвечаны развіццю абароны аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, а таксама іх выкарыстанню ў рэальным сектары эканомікі. Аб гэтым паведаміў падчас форуму «Інтэлектуальная ўласнасць у Беларусі. НЦІУ — 30 гадоў» міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ.**

— У нас ёсць добрыя прыклады, узяць хоць бы рэалізацыю ў галіне распрацовак новых лекавых прэпаратаў. Толькі тэхнапарк пры БДУ за мінулую пяцігодку атрымаў імпартазамяшчальны эфект больш як 40 млн долараў па патэнтах, якія зарэгістраваны ў Японіі і ЗША. Гэта сведчыць аб тым, што нашы распрацоўкі запатрабаваныя ў тым ліку і на сусветным рынку, — паведаміў міністр.

Андрэй Іванец адзначыў, што развіццё ўніверсітэцкай навукі застаецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці Міністэрства адукацыі. Кожны пяты патэнт на вынаходніцтва карыснай мадэлі — патэнт вучоных Мінадукацыі. «У нас ёсць універсітэты, якія з'яўляюцца лідарамі ў краіне па колькасці патэнтаў. Напрыклад, Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт. Гэта сведчыць аб тым, што ў нас развіваецца не толькі фундаментальная навука, але і яе прыкладны напрамак. Таму галоўная задача — забяспечыць эфектыўную камерцыялізацыю ўсіх існуючых распрацовак», — падкрэсліў ён.

Форум «Інтэлектуальная ўласнасць у Беларусі. НЦІУ — 30 гадоў» прымеркаваны да Сусветнага дня інтэлектуальнай уласнасці і юбілею Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці. У мерапрыемстве бяруць удзел кіраўніцтва Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, Міністэрства адукацыі, Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці, Еўразійскага патэнтнага ведамства Еўразійскай патэнтнай арганізацыі, Федэральнай службы па інтэлектуальнай уласнасці РФ і Дэпартамента эканамічнага супрацоўніцтва Выканаўчага камітэта СНД.

Запланаваныя ў рамках двухдзённага форуму семінары, дыскусіі і тэматычныя сесіі будуць прысвечаны ролі інтэлектуальнай уласнасці ў інавацыйным развіцці Беларусі і краін Еўразійскага эканамічнага саюза, пытанням і праблемам сучаснай камерцыялізацыі аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, палітыцы ў галіне інтэлектуальнай уласнасці для ВНУ і навукова-даследчых арганізацый, тэндэнцыям развіцця сістэм прававой абароны прамысловай уласнасці ў еўразійскім рэгіёне і іншым актуальным напрамкам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Бывайце здаровы!

# Паўночная хада

## Каму яна падыходзіць?

**Скандынаўская хада з'явілася ў Беларусі дзесяць гадоў таму. Чым яна палюбілася нашым суайчыннікам і чаго з яе дапамогай можна дамагчыся? Размаўляем з чалавекам, які стаяў каля вытокаў гэтага напрамку фітнесу ў нашай краіне.**

### «ЛЫЖНІКІ БЕЗ ЛЫЖАЎ»?

У Беларусі скандынаўская, яна ж паўночная, хада хутка здабыла папулярнасць. Што нядзіўна: гэта адзін з самых простых і даступных відаў фітнесу на свежым паветры, які не патрабуе, з аднаго боку, сур'ёзных матэрыяльных укладанняў у экіпіроўку, і, з другога, ён больш эфектыўны за звычайныя прагулкі і лягчэйшы за прабежкі.

— У 2012 годзе я шукаў для сябе новыя кірункі развіцця, — распавядае **заснавальнік Беларускай школы скандынаўскай хады Аляксандр МЕХ**. — Спыніўся на паўночнай хадзе — можа быць, таму, што з юнацтва сур'ёзна захапляўся лыжамі. А з гэтым відам фітнесу ўпершыню пазнаёміўся ў Еўропе (на той момант ён быў там на піку папулярнасці). Вывучыў тэхніку, ацаніў эфект ад трэніровак і вырашыў, што гэты кірунак можа быць настолькі ж цікавым для маіх суайчыннікаў, як і для мяне.

Тады гэта падавалася многім нечым незразумелым — «лыжнікі без лыжаў».

— Паспрабаваў пазнаёміць з гэтым відам аздараўленчай актыўнасці беларускія санаторыі. Але апошнія на той час проста не ведалі, як прапанаваць такі фітнес сваім кліентам, як яго пазіцыянаваць і як пра яго распавядаць. Не было ні інструктараў, ні экіпіроўкі, і я вырашыў заняцца згаданымі пытаннямі.

Скандынаўская хада — у цэлым малады від фітнесу: ён «нарадзіўся» ў 1997-м. Гэта вынаходніцтва фінскіх лыжнікаў: каб не страчваць спартыўную форму паміж снежнымі сезонамі, яны трэніраваліся, займаючыся хадой з лыжнымі палкамі. І іх вынікі пастаянна раслі. У 1997 годзе скандынаўская хада была запатэнтавана фінскім спартсменам Марка Кантанева як спорт для людзей любога ўзросту і любой фізічнай падрыхтоўкі. Заснавальнік змяніў канструкцыю лыжных палак ды распрацаваў методыку хады з імі. Сёння прыхільнікаў скандынаўскага шпацыру — каля 20 мільёнаў па ўсім свеце, а ўзрост аматараў — ад 4 да 90 гадоў (і нават старэйшыя).

**«Скандынаўская хада дазваляе атрымліваць нядрэнную аэробную нагрузку на свежым паветры і пры гэтым адпачываць ментальна — своеасаблівая дынамічная медытацыя».**

У Беларусі, удакладняе Аляксандр, і да таго як ён вырашыў папулярызаваць дадзены від фітнесу, былі асобныя людзі, што займаліся скандынаўскай хадой самастойна. Але калі не выконваць тэхніку, чалавек атрымлівае толькі каля 30 працэнтаў той карысці, якую можа даць гэты фітнес.

— А калі ставіцца больш грунтоўна, займацца з адпаведнай экіпіроўкай і тэхнікай, гэта сапраўды дазваляе ўмацаваць спіну і ў цэлым развіць тыя мышцы, што задзейнічаны ў здаровым фізіялагічным працэсе хады.

Сам Аляксандр правільную тэхніку скандынаўскай хады адточваў у Расіі. Там прыведзены від актыўнасці атрымаў распаўсюджанне на некалькі гадоў раней, чым з'явіўся ў нашай краіне, і дзесяць гадоў таму ўжо існавалі і школы, і сур'ёзныя спецыялісты, якія займаліся падрыхтоўкай інструктараў.

### ЯК ВЫЛУЧАЦЦА З НАТОЎПУ

Медыкі сцвярджаюць, што пры правільным выкананні скандынаўская хада задзейнічае каля 90 працэнтаў мышцаў цела.

— Я думаю, дакладна тое ніхто не падлічваў, — кажа суразмоўнік. — Гэта проста маркетынгавы ход. У фітнесе наогул шмат блытаніны, вытокі якой ляжаць у маркетынгу.

Узяць хоць бы назву — «скандынаўская хадзьба», або nordic walking. Насамрэч, радзіма гэтага віду фітнесу — Фінляндыя, якая да краін Скандынавіі не адносіцца. Але Скандынавія ва ўсім свеце асацыіруецца з высокім узроўнем жыцця і адказным стаўленнем да свайго здароўя — адсюль і назва, выйгрышная з маркетынгавага пункту гледжання.

— Ёсць таксама блытаніна і з тэхнікай скандынаўскай хады, — працягвае Аляксандр. — Гэта не проста ўзяць палачкі і пайсці, пераставўляючы іх перад сабой. Калі разглядаць класічную скандынаўскую хаду, яе тэхніка дазваляе ўключаць у работу мышцы спіны за кошт працяглага маху рукамі са штуршком у канцы. Сучасны чалавек практычна не карыстаецца мышцамі спіны. Мы кіруем машынай, мыем посуд, працуем на камп'ютары — усё гэта задзейнічае пярэднюю групу мышцаў. Ходзяць нашы сучаснікі, у асноўным трымаючы рукі ў кішэнях, прытрымліваючы сумку або трымаючы перад сабой мабільнік. «Уключаць спіну» ў нашы дні звычайнаму чалавеку, які не мае адносін да сур'ёзнага спорту, даводзіцца рэдка. У выніку мышцы спіны альбо ў гіпертонусе, альбо, з узростам, практычна атрафіруюцца. Скандынаўская ж хада паўтарае здаровую хаду чалавека — тое, як яна была задумана прыродай, з шырокім махам рукамі. Можна заўважыць, як у людзей, што некаторы час займаюцца скандынаўскай хадой, змяняецца паходка проста на вуліцы: яна становіцца больш лёгкай, грацыёзнай. Такі чалавек вылучаецца з натоўпу.



Бег трэніруе ў асноўным мышцы ніжняй паловы цела, у той час як скандынаўская хада — і верхнюю палову: мышцы спіны і плячэй. Як вынік, такі від фітнесу павялічвае аб'ём лёгкіх у адрозненне ад звычайнай хады, і пры гэтым спальвае ў паўтара раза больш калорый. Рэгулярныя заняткі зніжаюць артэрыяльны ціск, прыводзяць да нармалізацыі частаты пульсу і скарачаюць узровень цукру ў крыві. Плюс адсутнасць ударнай нагрузкі на суставы ног (як пры бегу трушком) і магчымасць даследаваць родны горад і наваколлі, пракладваючы маршруты. Словам, адны плюсы. А мінусы? Практычна ніякіх — хоць «сардэчнікам» усё ж варта перад пачаткам трэніровак параіцца з кардыёлагам. Дарэчы, захворванні суставаў ног (падагра, пятачная шпора і г. д.) не з'яўляюцца супрацьпаказаннямі — апора на кійкі зніжае нагрузку на таз, калені, косці ступні. Але згаданыя станоўчыя бакі можна рэалізаваць, толькі калі ўсё зрабіць правільна. Таму школа Аляксандра Меха займаецца падрыхтоўкай інструктараў скандынаўскай хады.

— Але гэта не асноўны кірунак нашай работы. Асноўнае — аказанне паслуг насельніцтву ў парках Мінска. Ёсць некалькі паркаў, дзе можна далучыцца да трэніровак з інструктарам. Напрыклад, мы рэгулярна праводзім трэніроўкі для ўсіх ахвотных у парку Перамогі. Там можна выбраць больш «лайтовы» від нагрузкі — групы, умоўна, для людзей «70 гадоў плюс-мінус»: група пад кіраўніцтвам інструктара праходзіць пяць-шэсць кіламетраў, выконвае сустаўную гімнастыку і пэўныя сілавыя практыкаванні.

Там жа дзейнічае і больш актыўная група — у асноўнай у ёй людзі 50-60 гадоў.

— Акрамя заняткаў ёсць і яшчэ адзін фактар, які ўключае людзей у фітнес, — дадае Аляксандр. — Магчымасць наладзіць камунікацыю, знайсці новыя знаёмствы і пабудаваць стасункі, што з узростам бывае складана.

Ёсць групы скандынаўскай хадзьбы ў Мядзвежыне, цяпер збіраецца група ў парку Чалюскінцаў. Там у асноўным людзі 30-40 гадоў, гатовыя прайсці вялікую адлегласць, у больш высокім тэмпе, часам нават за межамі горада.

### ДЫНАМІЧНАЯ МЕДЫТАЦЫЯ

Што прыцягвае ў скандынаўскай хадзьбе маладых?

— Многія гараджане шукаюць для сябе фізічную актыўнасць. Але не ўсім падыходзяць бег або басейн. Тут працуюць многія фактары: абмежаванні і па здароўі, і па спартыўнай падрыхтаванасці. І проста — не падабаецца. Пагадзіцеся, для многіх прабегчы нават кіламетр становіцца сур'ёзным выпрабаваннем. Скандынаўская хада дазваляе атрымліваць нядрэнную аэробную нагрузку на свежым паветры і пры гэтым адпачываць ментальна — своеасаблівая дынамічная медытацыя. Акрамя таго, яна дазваляе паступова ўвайсці ў актыўнасць: нехта пачынае з яе, а потым становіцца аматарам прабежак, а іншыя застаюцца ў гэтым відзе фітнесу і атрымліваюць вынікі.

Ці можна знізіць вагу пры дапамозе скандынаўскай хадзьбы? Аляксандр кажа, гэта адно з частых пытанняў да інструктараў ад людзей маладога ўзросту.

— Пахудзець можна, калі спалучаць скандынаўскую хадзьбу з дыетай. Для пахудзення патрэбныя доўгія дыстанцыі — метабалічныя працэсы, якія прыводзяць да зніжэння вагі, уключаюцца праз 30 хвілін бесперапыннай фізічнай актыўнасці. Не кожны від фітнесу здольны забяспечыць бесперапынную аэробную нагрузку на працягу досыць доўгага часу (напрыклад, у басейне звычайны чалавек наўрад ці будзе, не спыняючыся, плаваць на працягу 45-60 хвілін). Так што гэта нядрэнны спосаб прывесці ў норму фігуру.

Здараецца, кажа суразмоўнік, каб паскорыць працэс страты вагі, падчас заняткаў скандынаўскай хадой выкарыстоўваюць уцяжарвальнікі (заплечнік, спецыяльныя прыстасаванні на запясці і г. д.).

— Я не раіў бы гэтага. Уцяжарвальнікі негатыўна ўплываюць на правільнасць тэхнікі хады, ствараюць дадатковую нагрузку на пазваночнік. Яшчэ адзін народны спосаб пахудзець пры дапамозе хады з кійкамі — апрануцца цяплей, каб паскорыць потавыдзяленне. Але гэта, па-першае, неэфектыўна: з потам арганізм траціць ваду, а не тлушч, па-другое, стварае непатрэбную нагрузку на сэрца.

Скандынаўская хада — не спосаб рэзкага зніжэння вагі, які дасць вынік праз месяц, падкрэслівае спецыяліст. Яна павінна стаць часткай спосабу жыцця, і тады, не страціўшы здароўе, можна атрымаць стройную, падцягнутую фігуру.

Яшчэ адзін аспект, які прываблівае маладых, — спаборніцтвы. Так, скандынаўскі від фітнесу прадугледжвае такую магчымасць, і спаборніцтвы па ёй праводзіліся ў нашай краіне тры апошнія гады — у тым ліку на Аўгустоўскім канале. А ў цэлым, ёсць розныя напрамкі паўночнай хады, і кожны можа знайсці для сябе той, які яму бліжэй. Ёсць, у прыватнасці, турыстычны напрамак — падарожжа выхаднога дня. Ёсць спартыўны (спаборніцтвы). Ёсць уласна фітнес: зніжэнне вагі і прапрацоўка мышц, тут асаблівы ўхіл робіцца на тэхнічнасць хады з кійкамі. Ці, напрыклад, рэлакс-кірунак: Аляксандр кажа, яго часта выбіраюць мужчыны. У чымсьці ён падобны на рыбалку або паляванне: магчымасць пабыць у адзіноце на прыродзе, застацца сам-насам са сваімі думкамі, адпачыць ад клопатаў.

### ВЫБІРАЕМ КІЙКІ

Кійкі — адзіная неабходная для скандынаўскай хадзьбы спартыўная прылада. І на іх прыйдзецца выдаткаваць грошы. Лыжныя палкі, якія заваляліся на балконе, не падыдуць, яны прадугледжваюць іншую «растоўку».

Кійкі бываюць рознага кошту ў залежнасці ад вытворцы, матэрыялу і канструкцыі. Якасныя — праслужаць больш за тры гады. Не варта эканоміць на гэтым аксесуары, асабліва калі вы настроеныя на рэгулярныя заняткі. Перад купляй лепш пракансультавацца з інструктарам — напрыклад, пабываць на трэніроўцы ў парку, дзе ёсць магчымасць патрымаць у руках і паспрабаваць «у справе» правільныя кійкі.

Часам, кажа суразмоўнік, пад выглядам палак для скандынаўскай хады пачаткоўцу могуць прадаць трэкінгавыя палкі. Гэта зусім іншы від спорту: чалавек з заплечнікам падымаецца на гару і выкарыстоўвае палкі, каб размеркаваць нагрузку. Яны прызначаныя для таго, каб упірацца перад сабой, і не прадугледжваюць шырокага маху з раскрыццём далоні.

— Трекінгавыя палачкі прадугледжваюць больш масіўную ручку і пятлю для абхвату запясця. У іх няма паўпальчаткі, што надзяваецца на руку і дазваляе рабіць поўны мах і штуршок, не перанапружваючы плячо і локаць, — тлумачыць ён.

Пры выбары кійкоў для скандынаўскай хадзьбы варта таксама звярнуць увагу на наканечнік. Стальны — сатрэцца за адзін сезон. Выбар лепш спыніць на кійках з пабядзітавым наканечнікам, асабліва калі вы плануеце шмат хадзіць па асфальце.

«Тэлескапічныя» складаныя палкі дазваляюць набыць адзін камплект для ўсёй сям'і і рэгуляваць іх даўжыню пад рост кожнага, а таксама лёгка пераносіць іх у складзеным выглядзе. Але ў такім выпадку важна звярнуць увагу на тое, што паміж каленамі складнога кійка не павінна быць спружыны: яна будзе гасіць нагрузку пры штуршку і скажаць тэхніку хады. У цэлым, лепш выбраць суцэльныя карбонавыя палкі пад свой рост. Разлік просты: рост трэба памножыць на каэфіцыент 0,68, а атрыманы вынік акругліць да ліку, кратнага 5. Напрыклад, калі ваш рост 172 сантыметры, памнажаем 172 на 0,68 і атрымліваем 116,96. Акругляем вынік да 120 сантыметраў — гэта даўжыня кійкоў, што вам падыходзяць.

У камплект таксама павінны ўваходзіць гумавыя «боцікі» — заглушкі, якія памяншаюць стук. Гумавая насадка дазваляе дамагчыся лепшага счаплення з паверхняй, калі чалавек ідзе па асфальце. Хоць плітка і асфальт — не самыя спрыяльныя паверхні для заняткаў скандынаўскай хадзьбой.

— Найлепш абраць маршрут, што ідзе па грунце: такая паверхня мякчэйшая і, адпаведна, мякчэйшай будзе нагрузка на суставы ног і рук. Акрамя таго, зямля паляпшае счапленне наканечніка кійка з паверхняй, і мы адчуваем штуршок. На асфальце наканечнік імкнецца слізгануць, і чалавек перайначвае хадзьбу.

У цэлым, выбіраючы кійкі для скандынаўскай хады, варта разглядаць камплект коштам ад 150 рублёў, кажуць аматары гэтага віду фітнесу. Нятанна... Але ўкладанне досыць хутка акупіцца — паляпшэннем самаадчування, фігуры і псіхалагічным балансам.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

---

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Вырошчваць расліны з костачкі няпроста, але да чаго ж цікава! Костачка — гэта ядро, пакрытае драўнястай абалонкай. Часта костачкамі называюць і семечкі з цвёрдай абалонкай, напрыклад, у кавуна, хурмы ці граната.**

# РАСЛІНЫ, ЯКІЯ МОЖНА ВЫРАСЦІЦЬ З КОСТАЧКІ

### Абрыкос

Костачкі абрыкоса трэба пасадзіць адразу пасля вымання з мякаці плода. Прычым, калі вы сапраўды жадаеце атрымаць паўнавартаснае дрэва, спатрэбіцца не менш як 50 костачак. Усходжасць у абрыкоса невысокая, да 50 %, і ў першы год яшчэ чвэрць ад пасаджаных раслін загіне. Ідэальная глыбіня пасадкі — 5-6 см. Паміж раслінамі пакідаюць па 10 см. Каб зімоўка прайшла добра, пасадкі атуляюць яловымі лапкамі.

Першыя ўсходы абрыкоса з'яўляюцца ў маі. Для гэтага ўжо ў красавіку пачынаюць паліваць месца пасадкі. Сеянцы, якія пакажуцца, даволі капрызныя і ў першыя два месяцы асабліва маюць патрэбу ў вільгаці. У ліпені паліў скарачаюць, каб маладыя абрыкосы пачалі рыхтавацца да зімоўкі.

### Алыча

Костачка алычы прарастае 6-12 месяцаў. Костачку жаданага сорту алычы прамываюць ў праточнай вадзе і прасушваюць на анучцы. Высаджваць костачкі рэкамендуецца бліжэй да зімы, таму да гэтага часу іх лепш пакласці ў шкляную ёмістасць і захоўваць у сухім і цёмным месцы.

У канцы восені высаджваюць костачкі на глыбіню да 4 см. У адну лунку варта насыпаць адразу жменю костачак, бо большая частка з іх, хутчэй за ўсё, не ўзыдзе. У маі з'явяцца першыя ўсходы. У першыя часы іх можна прыкрыць ад сонца.

### Вішня

Вішня выдатна вырастае з костачкі. Новая расліна можа стаць насельніцай саду ці застацца на падаконніку ў якасці дэкаратыўнага дрэўца. Для пасадкі выбіраюць костачкі са спелых ягад. У якасці субстрату падыдзе сумесь з торфу, лісцвянай зямлі, дзёрну і рачнога пяску (1:1:1:0,2). У невялікі гаршчок лепш пасадзіць па некалькі костачак на глыбіню 2-3 см і паставіць у светлае і цёплае месца. Лепш зрабіць гэта на пачатку восені. Прыкладна праз месяц з'явяцца ўсходы. Паліваць іх трэба толькі цёплай вадой. Зімой тэмпература ў памяшканні не павінна апускацца ніжэй за 15 °С, інакш маладыя расліны загінуць.

### Манга

Манга ўжо даўно перастала быць дзівам у крамах, а некаторыя энтузіясты паспяхова вырошчваюць мангавае дрэва на падаконніку. Важна, каб костачка была са спелага плода, у якім лёгка аддзяляецца мякаць. Пасля вымання неабходна прамыць костачку ў праточнай вадзе і паскрэбці нажом. Каб яна хутчэй прарасла, рэкамендуецца апусціць костачку на тыдзень у ваду. Глебу можна абраць універсальную, галоўнае — не кіслую.



Пры пасадцы чвэрць костачкі павінна выступаць над паверхняй глебы. Пакуль не з'явіўся парастак, ёмістасць варта прыкрыць плёнкай. Неабходна рэгулярна правятрываць парнічок, а пасля з'яўлення ўсходаў прыбраць сховішча. Перасаджваць манга можна толькі пасля таго, як дрэўца цалкам адужае і прыжывецца. Для расліны таксама важныя вільготнае паветра і глеба. Але злоўжываць апырскваннямі і палівам не варта, каб на лісці і каранях не з'явілася цвіль.

У прыродзе мангавае дрэва вырастае вялікім, часам да 18 м у вышыню, а ў пакаёвых умовах можа вырасці да 2 м. Расліна не вельмі любіць перасадкі, таму лепш загадзя падрыхтаваць вялікі гаршчок.

### Персік

Многія скептычна ставяцца да вырошчвання персіка з костачкі, але на самай справе гэта цалкам рэальна! Бяром спелы персік, пажадана раяніраванага сорту, з задавальненнем з'ядаем, а костачку прамываем і высушваем. Пасадку лепш праводзіць бліжэй да канца восені, папярэдне патрымаўшы костачку пару дзён у вадзе.

Месца для пасадкі павінна быць сонечным і без скразнякоў. Костачку высаджваюць на глыбіню да 8 см, паліваюць і прыкрываюць пілавіннем або яловымі лапкамі. Увесну з'явяцца ўсходы. Маладая расліна мае патрэбу ў шчодрых палівах і апырскваннях, а таксама рэгулярных падкормах. Фарміраваць дрэва персіка можна толькі на другі год жыцця. Плоданашэнне магчымае праз тры-чатыры гады.

### Сліва

Пры вырошчванні слівы з костачкі звычайна ставяць мэтай атрыманне прышчэпы для прышчэпкі, бо паўнавартаснае сартавое дрэва атрымаць вельмі складана. Каб костачкі добра праraслі, іх спачатку вымочваюць каля чатырох дзён у свежай вадзе, а затым прасушваюць і стратыфікуюць у зімовы час у сумесі пілавіння і пяску. На працэдуру спатрэбіцца каля паўгода, а потым костачкі можна высаджваць у кантэйнеры вясной ці восенню. Калі прапусціць гэты этап, усходы будуць слабымі і наўрад ці пражывуць даўжэй за год. Зрэшты, усё залежыць і ад догляду, і ад умоў надвор'я. Галоўнае — рэгулярна паліваць і падкормліваць сеянцы, засцерагаць ад шкоднікаў і хвароб.

Калі сліва вырасце да памераў невялікага сеянца, можна перасаджваць яе ў сад. Лепш зрабіць тое ўвосень да першых замаразкаў, каб расліна паспела прыжыцца.

### Чарэшня

Костачкі чарэшні ўзыходзяць добра. На зіму іх змяшчаюць у пясок і захоўваюць пры тэмпературы 1-5 °С. Увесну пасля раставання снегу можна высаджваць костачкі ў гаршкі ці кантэйнеры. Часцей за ўсё садоўнікі выкарыстоўваюць вышэйпаказаны метад як спосаб атрымання добрай прышчэпы, на якую пасля можна будзе прышчапіць упадабаны сорт. Але некаторым удаецца з костачак выгадаваць прыстойныя пладаносныя дрэвы са смачнымі салодкімі ягадамі.

---

Даты | Падзеі | Людзі

**28 КРАСАВІКА**

У краіне

**1580** год — выдадзена «Евангелле»; яго пераклаў на старабеларускую мову, напісаў прадмову і выдаў у друкарні, заснаванай ім у сваім радавым маёнтку, Васіль Цяпінскі.

**1949** год — нарадзіўся (г. Жыткавічы) Уладзімір Іванавіч Буднік, беларускі кампазітар. У 1979—1984 гадах загадваў музычнай часткай Беларускага тэатра імя Я. Купалы. Працаваў у масавых жанрах, пісаў музыку для дзяцей. Сярод твораў: кантата «На магіле партызана», сімфанічная паэма «Сказ пра Палессе», сюіты для фартэпіяна, трубы і фартэпіяна, габоя і фартэпіяна, прэлюдыя і фуга для квартэта драўляных духавых інструментаў, песні, музыка да драматычных спектакляў.

**2004** год — Мінскі гарвыканкам і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь аб'явілі аб правядзенні адкрытага міжнароднага конкурсу на архітэктурна-мастацкае рашэнне для адной з зон мемарыяльнага комплексу «Трасцянец».

У свеце

**1907** год — нарадзілася Зоя Іванаўна Васкрасенская, савецкая разведчыца і дзіцячая пісьменніца. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. У 14 гадоў стала бібліятэкарам 42-га батальёна ВНК Смаленскай губерні, у 1923 годзе — палітруком у калоніі малалетніх правапарушальнікаў. У 1928 годзе Васкрасенская пераязджае ў Маскву і са жніўня 1929 года пачынае працаваць у Замежным аддзеле АДПУ (знешняя разведка). Першая паездка на разведвальную работу — у Харбін, дзе Зоя Іванаўна на працягу двух гадоў паспяхова выконвала адказныя заданні Цэнтра падчас барацьбы на КУЧ. Пазней была на разведвальнай рабоце ў Латвіі, Германіі і Аўстрыі. У Маскву вярнулася перад самай вайной і стала адным з асноўных аналітыкаў разведкі. Да яе сыходзіліся важныя звесткі, у тым ліку ад прадстаўнікоў вядомай «Чырвонай капэлы». З 1941 да 1944 года знаходзілася ў Швецыі, дзе паслом была А. М. Калантай, якая працавала з ёй у цесным супрацоўніцтве. Пасля выхаду ў адстаўку ў званні палкоўніка занялася пісьменніцкай працай, была прынята ў члены СП СССР. Толькі за перыяд з 1962 да 1980 года яе кнігі былі апублікаваны тыражом больш як 21 мільён 640 тысяч экзэмпляраў.



**1924** год — нарадзіўся Данатас Юозавіч Баніёніс, літоўскі і савецкі акцёр і рэжысёр, грамадскі дзеяч, народны артыст СССР. Здымаўся ў фільмах «Ніхто не хацеў паміраць», «Мёртвы сезон», «Салярыс», «Нікола Паганіні» і іншых. Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

**1945** год — часці Чырвонай Арміі пачалі штурм Рэйхстага.

**1988** год — М. Гарбачоў на сустрэчы ў Крамлі з патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Піменам аб'явіў аб вяртанні царкве культавых будынкаў.

Так гаварыў...

**ГЕНАДЗЬ БУРАЎКІН:**

*«Шукаем сцежак невядомых,*
*Чужыя топчам бальшакі.*
*А песні нас чакаюць дома,*
*Ля цёплай матчынай шчакі».*

---

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.40 | 20.35 | 14.55 |
| Віцебск — | 5.26 | 20.29 | 15.03 |
| Магілёў — | 5.30 | 20.25 | 14.55 |
| Гомель — | 5.32 | 20.17 | 14.45 |
| Гродна — | 5.56 | 20.50 | 14.54 |
| Брэст — | 6.01 | 20.45 | 14.44 |

### Месяц

***Апошняя квадра 23 красавіка. Месяц у сузор'і Авена.***

### Імяніны

***Пр.*** *Анастасіі, Васілісы, Аляксандра, Андрэя, Арыстарха, Віктара, Кандрата, Трафіма, Якава.*

***К.*** *Кацярыны, Рыты, Людовіка, Роберта.*




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### УСМІХНЕМСЯ

**— Тут пляж, тут нельга рыбачыць!**
**— А я і не рыбачу, я купаю свайго чарвяка!**
**— Тады з вас штраф — тысяча рублёў!**
**— За што?!**
**— Дык у вас чарвяк без плавак!**

Псіхолагі сцвярджаюць, што адначасовыя стасункі з дзвюма дзяўчынамі з розным колерам валасоў неверагодна матывуюць падтрымліваць кватэру ў чысціні.

**Я пахудзею да лета. Не ведаю, да якога, але пахудзею.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 981.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 27 красавіка 2022 года.